Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 СНЕЖНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №241 (28605)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 парад ад паспяховага бізнесмена

СТАР. 4

Сямейная газета



Калі інтэрнэт даражэйшы за дзіця...

Стаматолаг пра карыес, жуйкі ды адбельванне

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:

«Вялікі рэзерв інавацыйнага развіцця застаецца ў кантэксце Саюзнай дзяржавы. У сваёй парламенцкай дзейнасці мы пастаянна звяртаем увагу інтэграцыйных структур на тое, што трэба глядзець на перспектыву, на будучыню. А для гэтага можна аб'яднаць інтэлектуальны, вытворчы, сыравінны патэнцыял і ствараць магутныя кампаніі, развіваць віды дзейнасці сумесна з Расіяй ці ў рамках ЕАЭС. Пакуль гэты патэнцыял задзейнічаны не поўнасцю. Адна з прычын — бюракратычныя бар'еры. Некаторыя вучоныя адмаўляюцца ініцыяваць перспектыўныя праекты і праграмы, бо за час узгаднення яны могуць страціць сваю актуальнасць».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.12.2017 г.

Долар ЗША		2,0378 ▲
Еўра		2,3937 ▲
Рас. руб.		0,0344 ▼
Укр. грыўня		0,0747 ▲

ISSN 1990 - 763X

ЯК БУДЗЕМ РАЗВІВАЦЬ ІНТЭЛЕКТ ДЗЯРЖАВЫ

Кіраўнік краіны абазначыў прыярытэты айчыннай навукі

У першую чаргу з'езд — своеасаблівы мазгавы штурм, мабілізацыя інтэлектуальнай эліты нашага грамадства на рашэнне найбольш перспектыўных і актуальных праблем. На гэтым зрабіў акцэнт у сваім выступленні на II З'ездзе вучоных Беларусі Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Ён назваў як поспехі айчыннай навукі, так і праблемныя моманты, а таксама агучыў кірункі развіцця на далейшыя гады.

Першы з'езд вучоных праходзіў дзесяць гадоў таму, і тады магістральным кірункам быў вызначаны прыкладны характар айчыннай навукі. За мінулыя гады зроблена нямала, што не дзіўна: у Беларусі працуюць вучоныя з сусветнымі імёнамі. Ды і па шэрагу навуковых даследаванняў атрыманы рэзультаты, прызнаныя ў свеце. Так, нашы машынабудаўнікі разам з навукоўцамі стварылі самы вялікі кар'ерны самазвал БелАЗ грузападымальнасцю 450 тон. Распрацаваны і ўжо выпускаецца айчынны электробус з хуткай зарадкай.

Звярнуў кіраўнік дзяржавы ўвагу і на той факт, што дзякуючы пераважна айчынным тэхналогіям была вырашана праблема харчовай бяспекі. Мы не проста сталі ў гэтым плане самадастатковымі, але і экспартаарыентаванымі: доля экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання ў аб'ёме экспарту тавараў па выніках мінулага года склала амаль 18%!

Ганарыцца дзяржава распрацоўкамі айчынных фармацэўтаў, медыкаў. А будаўніцтва атамнай станцыі ўвогуле сфарміравала новую навукаёмістую галіну нашай эканомікі:

— Усе вы ведаеце, якое раўнівае стаўленне ў некаторых нашых суседзяў да будаўніцтва і гарантавання бяспекі беларускай АЭС. Пераканаўчым навуковым адказам апанентам у гэтым пытанні з'яўляецца распрацоўка сусветнага ўзроўню — аўтаматызаваная сістэма кантролю радыяцыйнай абстаноўкі вакол аб'екта.

Звяртаючыся да гэтай тэмы, Прэзідэнт заявіў:

— Скажу адкрыта нашым суседзям, перш за ўсё тым, хто так перажывае за будаўніцтва станцыі. Па-першае, бяспека — гэта наш клопат. Мы перш за ўсё зацікаўлены ў бяспечнай станцыі. Па-другое, замест таго, каб тарпедаваць некаторыя пытанні будаўніцтва атамнай станцыі — мы ж усё роўна яе пабудуем... замест таго, каб весці размову аб спыненні будаўніцтва, закрыцці — я ўжо прапаноўваў суседзям: давайце разам падумаем, як яе эксплуатаваць, як атрымаць танную электрычную энергію і забяспечыць ёй не толькі Беларусь — а ў нас будзе прафіцыт гэтай энергіі, — але і суседзяў.

Беларуская навука годна прадстаўлена і ў касмічнай сферы, на сусветным рынку ваенных тэхналогій айчынная прадукцыя таксама карыстаецца попытам.

— Рэзультатыўнасць беларускай навукі адлюстроўваюць паказчыкі міжнародных рэйтынгаў, — аргументаваў Аляксандр Лукашэнка. — Так, па індэксе ведаў Беларусь займае 45-е месца сярод амаль 200 краін і палепшыла гэты паказчык за апошнія пяць гадоў на 14 пунктаў.

У красавіку бягучага года Прэзідэнт даручаў кіраўніцтву Нацыянальнай акадэміі навук і ўраду максімальна вырашыць праблемныя пытанні навуковай дзейнасці. Цяпер настаў час удакладніць прыярытэты, канкрэтызаваць пастаноўку навуковых задач. На думку беларускага лідара, трэба больш актыўна практыкаваць стварэнне і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы заводскіх даследчыцкіх лабараторый, цэнтраў і доследных вытворчасцяў. Акрамя гэтага, Аляксандр Лукашэнка назваў непрымальнай сітуацыю з тэрмінамі падрыхтоўкі і ўкаранення навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ — калі на гэта сыходзяць гады.

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.

Ідэя+

Сумесны праект з камітэтам эканомікі Магілёўскага аблвыканкама

ЧАЛАВЕК, ЯКІ ПАБУДАВАЎ ЗАВОД

Дырэктар магілёўскага прадпрыемства «Тэхналіт» Аляксандр Бадзяка пра тое, чаму інавацыі цяжка прыжываюцца на прадпрыемствах і навошта трэба перачытваць Пушкіна

Навука і эканоміка — паняцці супастаўныя. Узровень развіцця краіны цалкам залежыць ад таго, наколькі актыўна прадпрыемствы выкарыстоўваюць інавацыі. На жаль, не заўсёды навуковыя распрацоўкі адразу ж знаходзяць сабе прымяненне на практыцы. Але ёсць такія апантаныя людзі, якія ідуць на неверагодныя ўчынкі, каб толькі рэалізаваць сваю ідэю. Бо бачаць на паўкроку наперад, чым іншыя. Адзін з іх Аляксандр Міхайлавіч БАДЗЯКА — кандыдат тэхнічных навук, кіраўнік унікальнага прадпрыемства па вытворчасці камплектуючых і запасных частак для аўтатрактарнай, дарожнай, чыгуначнай, сельскагаспадарчай, будаўнічай і спецыяльнай тэхнікі. Ён жа — «Чалавек года», лаўрэат Дзяржаўнай прэміі ў галіне навукі і тэхнікі, уладальнік медаля Францыска Скарыны. Завод, які ён стварыў 20 гадоў таму, і зараз лічыцца адным з перадавых у свеце. Над працоўным сталом Аляксандра Бадзякі лунае бусел з поршневым кальцом у дзюбе. Гэта таварны знак прадпрыемства, сімвал таго, што такую прадукцыю ў Беларусі яшчэ ніхто дагэтуль не рабіў. У такіх пытаннях Бадзяка наогул педант. Для яго вельмі важна, каб нішто не скажала сэнс — ні ў сімвалах, ні ў словах. Яшчэ ў школе яму, зусім яшчэ малому хлопцу, цікавасць да пазнання навакольнага свету прывілі два чалавекі — матэматык і настаўнік рускай літаратуры, які падараваў трэцякласніку трохтомнік Аляксандра Пушкіна. У выніку атрымаўся «паэт» з тэхнічным ухілам. Не дзіўна, што суразмоўца не аднойчы падмацоўваў свае думкі вершаванымі цытатамі. І гэта пры тым, што размова ішла выключна пра навуку і прамысловасць.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ЦІ МІКРАХВАЛЁЎКУ!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ЯК БУДЗЕМ РАЗВІВАЦЬ ІНТЭЛЕКТ ДЗЯРЖАВЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу ўдзельнікаў з'езда на шэрагу кірункаў удасканалення і далейшага развіцця айчыннай навукі.

...Па вытворчасці

— Трэба сумесна вырашыць асноўныя праблемы машынабудавання, прамысловасці ў цэлым. Бо менавіта ў прамысловасці — ядро ўсіх інавацый. Няма краін з моцнай навукай і слабай прамысловасцю — і наадварот, — заявіў Прэзідэнт.

Прамысловасць разам з навукай павінны вызначыць кірункі дыверсіфікацыі і мадэрнізацыі вытворчасцяў, забяспечыць сістэматычную работу па ацэнцы надзейнасці і якасці прадукцыі, павысіць высокатэхналагічнасць вытворчасці. Асобнае даручэнне Аляксандра Лукашэнкі датычылася распрацоўкі праграмы развіцця электратранспарту. Сярод іншага яна павінна ўключаць стварэнне і выпуск айчынных элементаў электрапрывада і акумулятараў.

...Па сельскай гаспадарцы

— Вучоным неабходна распрацаваць, а Мінсельгасхарчу — рэалізаваць комплекс мер па павышэнні ўзроўню рэнтабельнасці сельгаспрадпрыемстваў, — даручыў кіраўнік краіны. Ён звярнуў увагу навукоўцаў Аляксандр Лукашэнка. — Робатызацыя ахоплівае прамысловасць і сяло. IT-платформы выціскаюць традыцыйны гандаль, блокчэйн — фінансы. Штучны інтэлект усё часцей замяняе чалавека ў прывычных сферах жыцця. І ў нас інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі трэба накіроўваць на стварэнне інтэлектуальных сістэм апрацоўкі звышвялікіх аб'ёмаў даных, падтрымкі прыняцця рашэнняў для органаў дзяржаўнага кіравання, «воблачных» і іншыхтэхналогій.

...Па стварэнні навукова-тэхнічных паркаў

У прыватнасці, у сферах бія- і нанатэхналогій, фармацыі і прыладабудавання.

— Вы прапануеце, каб платформай для паскарэння работ па даследаваннях і стварэнні айчыннай фармацэўтычнай, бія- і нанатэхналагічнай прадукцыі стаў Нацыянальны навукова-тэхналагічны парк «БелБіяград». Я шмат над гэтым думаў. Трэба разумець, што калі паглядзець на сутнасць вашых прапаноў, то вы хочаце нейкія прадпрыемствы, групы навукоўцаў, нейкія кірункі зняць з навукі і змясціць у нейкі «град». Не ведаю, калі без гэтага не могуць развівацца кірункі ў галіне бія- і нанатэхналогій, прыладабудавання, — ну давайце

Фота БЕЛТА.

увагу, што ў нашай аграрнай сферы захоўваецца шэраг унутраных праблем эканамічнага, сацыяльнага характару, вырашаць якія неабходна з апорай на навуку.

...Па IT-тэхналогіях

Літаральна днямі кіраўнік дзяржавы праводзіў нараду па праекце дэкрэта «Аб развіцці лічбавай эканомікі ў краіне». Тады ж Прэзідэнт адзначыў: лічбавая трансфармацыя эканомікі з'яўляецца адным з ключавых прыярытэтаў.

— Паглядзіце, што зараз адбываецца, — акцэнтаваў іх змесцім у нейкі «град» накшталт Беларуска-кітайскага парка «Вялікі камень», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Але, адзначыў Прэзідэнт, калі мы можам працаваць зыходзячы з таго, як зараз развіваюцца ў нас гэтыя кірункі, даваць рэзультат — то навошта ламаць сістэму? І траціць на гэта вялікія грошы — а лішніх у нас, як вядома, няма.

...Па гуманітарных навуках

У іх свая функцыя, не менш важная. На думку Аляксандра Лукашэнкі, «найважнейшым прадуктам гуманітарных ведаў з'яўляюцца сацыяльныя тэхналогіі»:

— Сёння ствараюцца рэцэпты кіравання свядомасцю людзей. Гэтыя тэхналогіі дзейнічаюць і за межамі краіны — праз СМІ, інтэрнэт і не заўсёды на карысць Беларусі. Трэба навучыцца супрацьдзейнічаць негатыўным тэндэнцыям у гэтай сферы. Трэба распрацоўваць уласныя сацыяльныя тэхналогіі, выкарыстоўваючы іх для кансалідацыі грамадства, выхавання патрыятызму, стымулявання творчай ініцыятывы людзей на ўсіх узроўнях.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што сёння і ў сродках масавай інфармацыі, і ў інтэрнэце шмат меркаванняў розных «псеўдааналітыкаў, якія імкнуцца разбурыць стабільнасць і спакой у нашым грамадстве — і не толькі ў нашым». Трэба, упэўнены кіраўнік краіны, каб у адказ гучаў голас аўтарытэтных навукоўцаў-дзяржаўнікаў.

...Па фінансаванні навукі

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на эфектыўнасць выкарыстання навукай капіталаўкладанняў у яе. Павінна быць аддача:

— Ад усіх арганізацый і галін мы патрабуем галоўнага — рэзультату. Я паўтару: не будзе рэзультату — не будзе грошай. Навука ад выканання гэтага патрабавання не павінна заставацца ўбаку.

Ёсць і іншы бок медаля — не выкарыстоўваюцца ўсе сродкі з інавацыйных фондаў — і гэта таксама недапушчальна.

— У нас велізарныя грошы пры ўсіх скаргах вучоных штогод не асвойваюцца! За 11 месяцаў гэтага года рэспубліканскі і мясцовыя інавацыйныя фонды выкананы: рэспубліканскі — на 41%, мясцовы — на 24% ад гадавога плана. Якіх вам яшчэ грошай не хапае? Яны ж ляжаць, вазьміце іх! — заклікаў Прэзідэнт. У гэтай сувязі ён нагадаў пра 15-мільярдны льготны крэдыт для Беларусі ад КНР, які таксама асвойваецца даволі марудна.

...Па навуковых кадрах

Прэзідэнт параіў закладваць інтарэс да навукі яшчэ ў школе. Важна, каб не перарывалася сувязь паміж школай і ўніверсітэтамі, а то часта ва ўстановах вышэйшай адукацыі не ведаюць, колькі адораных выпускнікоў школ сталі іх студэнтамі. Для таго каб не было кадравага голаду ў навуцы, створана многае: напрыклад, ёсць фонды таленавітай і адоранай моладзі.

— Мы можам па праве ганарыцца дасягненнямі нашых школьнікаў, студэнтаў на міжнародных алімпіядах. Найбольш адораныя атрымліваюць падтрымку спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі. Надышоў час вывесці работу з такой моладдзю на якасна новы ўзровень: аб'яднаць рэсурсы найбольш таленавітых вучоных і педагогаў у рабоце з падрастаючым пакаленнем на высокатэхналагічных навуковых пляцоўках, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Звярнуўся кіраўнік краіны і да тэмы прэстыжу навукі, прафесіі вучонага — зараз гэты прэстыж паступова вяртаецца, і дзяржава, у сваю чаргу, прыкладае шэраг намаганняў. Гэта і павышэнне заработнай платы ў сферы, і вырашэнне жыллёвай праблемы маладых навукоўцаў... Усё для таго, каб краіна развівалася і была сапраўды інтэлектуальнай. Прынамсі, менавіта так — «Беларусь інтэлектуальная» — вызначана будучая мадэль нашай краіны ў праекце стратэгіі «Навука і тэхналогіі: 2018—2040», які разгледзеў і ўхваліў з'езд вучоных.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■ Абмеркаванне

ПЛАН НА 20 ГАДОЎ

На II З'ездзе вучоных ухвалілі стратэгію «Навука і тэхналогіі: 2018—2040». У Палацы Рэспублікі сабраліся больш за 2500 прадстаўнікоў навукі (і айчыннай, і замежнай), каб падвесці вынікі года і скласці планы на будучыню. На выстаўцы ў фае паказалі сённяшнія дасягненні: ад сучасных касмічных тэхналогій да археалагічных знаходак IV—III тысячагоддзяў да нашай эры. Падчас мерапрыемства быў заслуханы шэраг дакладаў. Наш карэспандэнт занатаваў асноўныя моманты.

Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, звярнуў увагу, што толькі сёлета было распрацавана каля 40 нарматыўна-прававых актаў, накіраваных на ўдасканаленне навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці. Цяпер стаіць задача павысіць навукаёмістасць ВУП да 1% да 2020-га і далей паэтапна да 3% — гэта сусветны ўзровень.

Сярод дасягненняў бягучага года Уладзімір Гусакоў адзначыў распрацоўку партатыўнага суперкамп'ютара, мацнейшага за СКІФ у 2,5 раза, і станцыю ў Антарктыдзе, якая будзе дзейнічаць круглы год. Ён адзначыў, што «зараз мы імкнёмся дабівацца поўнага асваення распрацовак, атрыманых па ўсіх праграмах навуковых даследаванняў». Да таго ж пастаўлена задача, каб пры кожным інстытуце была свая навукаёмістая вытворчасць або гаспадарчаразліковае камерцыйнае падраздзяленне. За два апошнія гады стварылі 18 такіх аб'ектаў.

Старшыня Прэзідыума НАН таксама растлумачыў, што стратэгія да 2040-га будзе рэалізавана ў тры этапы. Першы — да 2020-га — будзе прысвечаны актуалізацыі зачынаў, якія ёсць, з улікам сусветных дасягненняў. Другі — да 2030-га — завяршэнню лічбавай мадэрнізацыі традыцыйных галін эканомікі і фарміраванню комплексу ключавых канкурэнтных пераваг. Трэці — да 2040-га — нарошчванню кампетэнцый мэтавых сегментаў інтэлектуальнай эканомікі і выхаду на лідзіруючыя пазіцыі па асобных навукова-тэхнічных напрамках.

Далейшае развіццё навукі немагчыма без моцнай падрыхтоўкі кадраў. Зараз ідзе распрацоўка стандартаў адукацыі пакалення «3+», якія ўключаюць у тым ліку развіццё прадпрымальніцкіх здольнасцяў. **Рэктар БДЭУ Уладзімір ШЫМАЎ** звярнуў увагу на пэўныя праблемы навукова-адукацыйнага комплексу. Аляксандр Лукашэнка па выніках даклада прапанаваў распрацаваць у наступным годзе ў рамках ВНУ сістэму матывацыі вучоных.

Пра супрацоўніцтва беларускай і расійскай навукі гаварыў **Аляксандр СЯРГЕЕЎ, прэзідэнт Расійскай акадэміі навук.** Ён прапанаваў ажыццяўляць новыя праекты па сельскай гаспадарцы, напрыклад па дакладным земляробстве, разумнай сельскай гаспадарцы, робатызацыі гэтай галіны, па глыбокай перапрацоўцы, якая мае вялікі экспартны патэнцыял. Таксама перспектыўна выглядае кааперацыя ў медыцыне, напрыклад у прамянёвай тэрапіі. Але беларуская і расійская акадэміі навук адрозніваюцца па структуры і ў падыходах да свайго развіцця. Кіраўнік нашай дзяржавы адзначыў, што будзе ў найбліжэйшы час сустракацца з прэзідэнтам Расіі і ўзніме пытанне аб павышэнні статусу Расійскай акадэміі навук. Навукоўцы працуюць у адным напрамку, і інтэграцыя ў гэтым плане дапаможа хутчэй рухацца наперад.

Пра развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў навуцы выказаўся і **старшыня Выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар Садружнасці Незалежных Дзяржаў Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ.** Дарэчы, у наступным годзе пройдзе II Форум вучоных СНД у Ерэване. На ім плануецца вызначыцца з практычнымі сродкамі ўзмацнення інтэграцыйнага працэсу ў навуковай сферы. Разам з тым праблемным пытаннем застаецца стварэнне міждзяржаўнага фонду навуковых даследаванняў. З аднаго боку, ёсць зацікаўленасць вучоных, з другога — фінансавы складнік патрабуе абгрунтавання і ўзгаднення на экспертным узроўні, што зараз і адбываецца. Сёння ў рамках СНД рэалізуецца дзесяць пілотных інавацыйных праектаў, у дзевяці з якіх задзейнічаны беларускія вучоныя.

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

■

■ У ліку найлепшых

Ушануюць маладых аграрыяў

Сёння найлепшым маладзёжным экіпажам і маладым кіроўцам Міншчыны па выніках уборачнай кампаніі — 2017 уручаць грашовыя прэміі.

Урачыстая цырымонія ўшанавання пераможцаў маладзёжнага конкурсу «Моладзь Міншчыны — за ўраджай», у якім сёлета спаборнічалі 247 маладзёжных экіпажаў і 195 маладых кіроўцаў вобласці, пройдзе ў боўлінг-цэнтры Madison.

Мінская вобласць з'яўляецца лідарам сярод аграрыяў краіны. Сваю лепту ў агульны каравай унеслі і маладзёжныя экіпажы, якія намалацілі 188 047,685 тоны збожжа (маладыя кіроўцы — перавезлі 183 682,5 тоны).

У мерапрыемстве прымуць удзел больш за паўсотні маладых перадавікоў уборачнай. Акрамя ўрачыстай цырымоніі, для іх традыцыйна будзе арганізаваны абласны турнір па боўлінгу: 22 каманды лідараў уборачнай Міншчыны будуць змагацца за тытул самай «прасунутай» каманды не толькі ў прафесіі, але і ў спорце.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

■ Камунальныя стасункі

У ЖЭСы набяруць псіхолагаў?

Падзел функцый заказчыка і падрадчыка, стварэнне адзінага цэнтра для зваротаў грамадзян «115» дазволілі больш аператыўна рэагаваць на заўвагі спажыўца і павысіць якасць паслуг за кошт незалежнага кантролю і павышэння канкурэнтнасці асяроддзя.

Начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і сродкамі масавай інфармацыі Мінжылкамгаса Генадзь АКСЦІЛОВІЧ адзначыў, што станоўчыя вынікі сталі найлепшым доказам правільнасці абранай стратэгіі і эфектыўнасці структурных пераўтварэнняў. Тым не менш для павышэння якасці работы з насельніцтвам застаецца яшчэ нямала рэзерваў. Працу на прадпрыемствах трэба арганізаваць такім чынам, каб ні адзін зварот не застаўся без увагі. Для гэтага мэтазгодна разгледзець магчымасць стварэння ў кожнай службе ЖКГ сталіцы аддзелаў па рабоце з кліентамі. Для такіх падраздзяленняў трэба падабраць спецыялістаў адпаведнай кваліфікацыі, якія не толькі разбіраюцца ў вытворчых пытаннях, але і валодаюць пэўнымі ведамі ў сферы псіхалогіі.

«Спажывец павінен бачыць у службе заказчыка непасрэднага абаронцу сваіх інтарэсаў і давяраць ёй,— лічыць Генадзь Аксціловіч. — Толькі так можна наладзіць бездакорную зваротную сувязь, якая дапаможа своечасова выяўляць існуючыя праблемы і прымаць меры па іх ліквідацыі. Вопыт Мінска паказаў, што вынік работы залежыць не толькі ад укаранення сучасных тэхналогій, але і ад умення размаўляць з людзьмі, ад здольнасці пачуць спажыўца і знайсці з ім паразуменне».

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■

Падтрымка талентаў дзеля вялікіх перамог

У Нацыянальным алімпійскім камітэце адбылася цырымонія ўручэння імянных пасведчанняў перспектыўным спартсменам і трэнерам

На гэты раз рэкордная колькасць маладых атлетаў стане стыпендыятамі рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Прэзідэнцкі спартыўны клуб». З 210 атлетаў, якія ўвайшлі ў спіс, 178 былі пераможцамі і прызёрамі чэмпіянатаў свету і Еўропы, Кубкаў свету і Еўропы ў 2017 годзе.

Найбольш значных поспехаў дабіліся Хрысціна Стараселец і Таццяна Клімовіч (веславанне акадэмічнае), якія перамаглі на чэмпіянаце свету і Еўропы сярод моладзі. Адзначым, што ўпершыню ў лік стыпендыятаў увайшла зборная Беларусі па валейболе да 18 гадоў, якая заняла 3-е месца на чэмпіянаце Еўропы ў Нідэрландах. Дзюдаіст Данііэль Мукеце стаў найлепшым на кантынентальным першынстве, агульны залік Кубка свету ў трэкавай дысцыпліне скрэтч выйграў веласіпедыст Яўген Каралёк.

У ліку стыпендыятаў таксама прадстаўнікі біятлона, канькабежнага спорту, фрыстайлу, што сімвалічна напярэдадні зімовай Алімпіяды. Дарэчы, упершыню ў спісе стыпендыятаў прадстаўлены і снаўборд.

— Да зімовай Алімпіяды ў Рэспубліцы Карэя застаецца менш за два месяцы. Авангард беларускага спартыўнага руху выходзіць на фінішную прамую падрыхтоўкі да галоўных стартаў чатырохгоддзя, а мы будзем рыхтаваць вядучым атлетам годную змену, — адзначыў **старшыня цэнтральнага савета Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрый ЛУКАШЭНКА.** *— Большасць прысутных атлетаў з'яўляецца пераможцамі або прызёрамі розных буйных міжнародных спаборніцтваў. Гэта новая вышыня, якая сведчыць не толькі аб колькасці, але і аб якасці падрыхтоўкі маладых спартсменаў.*

Дзмітрый Лукашэнка пажадаў маладым атлетам максімальна выкарыстоўваць свой талент і адзначыў, што стыпендыі Прэзідэнцкага спартыўнага клуба — гэта не вынік, а толькі адна з прыступак на цяжкім і доўгім шляху ў вялікі спорт. У цырымоніі ўручэння імянных стыпендый таксама прынялі ўдзел першы віцэ-прэзідэнт НАК Андрэй Асташэвіч і намеснік міністра спорту і турызму Міхаіл Партной. Сярэдні памер стыпендыі атлетам складзе BYN7143 у год, трэнерам — BYN7600 у год, фінансавая падтрымка будзе ажыццяўляцца на працягу ўсяго 2018 года.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

Лямус: ад склепа да музея

У самым старажытным на Беларусі драўляным будынку размесціцца выставачная экспазіцыя

Унікальны помнік архітэктуры знаходзіцца ў дворыку былога Брыгіцкага манастыра і датуецца другой паловай XVIII стагоддзя. Зараз тут вядуцца работы па яго кансервацыі. Пасля цэлага комплексу аднаўленчых мерапрыемстваў старажытны лямус будзе даступны для гараджан і турыстаў.

Можна сказаць, што работы пачаліся своечасова, бо фундамент прасеў і двухпавярховы драўляны будынак пачаў нахіляцца набок. Таму ў першую чаргу заняліся гэтай праблемай. Было яшчэ некалькі абцяжваючых абставін, кажа **навуковы кіраўнік аб'екта, архітэктар інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Алена ШЧАСНАЯ.** Напярэдадні разабралі цагляныя коміны, унутраныя перагародкі і пашкоджаныя бэлькі перакрыцця, якія надавалі будынку прасторавую жорсткасць. Да таго ж і некаторыя кроквы на вуглах былі падгнілыя.

— Трэба было выраўняць лямус так, каб ён не абваліўся, — кажа Алена Шчасная, — улічваць яшчэ і вугал страхі, а яна па вышыні амаль 5 метраў. Таму задзейнічалі адразу шэсць дамкратаў, адзін з якіх не вытрымаў цяжару і зламаўся. Будынак практычна вісеў у паветры, але гэта было патрэбна для выканання бутавага падмурка і замены ніжняга шэрагу брусоў, пашкоджаных гніллю і спарахнелых на вуглах.

Пасля таго, як падвялі падмурак, заняліся сценамі. Каркас з абодвух бакоў замацавалі вертыкальнымі брусамі, каб выцягнуць яго і выраўняць. Такі страхавы пояс засцерагае сцяну ад нераўнамернага ўсаджвання. Ён часовы — праз некаторы тэрмін яго здымуць. Замененыя брусы з часам набудуць такі жа серабрыста-шэры колер, як і ўвесь будынак. Шчыліны на наступны год будуць замазаны смалой з апілкамі. Лямус нядрэнна захаваўся, хоць і прастаяў больш за 200 гадоў, — лічаць архітэктары.

Цікава, што драўляныя лямусы будаваліся без металічных матэрыялаў. Праўда, на працягу існавання будынка яго ўзмацнялі цвікамі і скобамі. Калі яны з'явіліся — невядома. Рэстаўрацыя таксама без гэтага не абыдзецца, бо сцены трэба замацаваць як след. Потым лішнія цвікі прыбяруць. А вось металічныя пруты пад падлогай і паміж паверхамі застануцца, але іх не будзе відаць.

— Прыходзіцца ратаваць будынак усімі магчымымі спосабамі, — прызнаецца Алена Шчасная, — прымяняць сучасныя тэхналогіі, дзе патрэбна. Раней такіх не было, можа і не спадзяваліся тыя будаўнікі, што звычайная гаспадарчая пабудова прастаіць некалькі стагоддзяў...

Такі вялікі драўляны лямус у Гродне — адзіны ў краіне, адзначае **загадчык кафедры архітэктуры жылых і грамадскіх будынкаў БНТУ, прафесар Сяргей СЕРГАЧОЎ.** Хоць некалі іх было шмат у Заходняй Беларусі, асабліва на Піншчыне. Існаваў прыгожы лямус у Ашмянскім раёне. Яшчэ адзін захаваўся на былой сядзібе Міцкевічаў у Баранавічах. Слова «лямус» нямецкага паходжання і перакладаецца як «домік з гліны». Пабудова мела гаспадарчае прызначэнне, там захоўваліся прадукты, прылады працы, збожжа, а на другім паверсе маглі жыць работнікі. Будаваліся лямусы на панскіх альбо манастырскіх сядзібах, звычайна ў паркавай зоне, таму мелі прыгожае аздабленне балюстрадамі, галерэямі, аркамі, лоджыямі, калонамі. У драўляных канструкцыях ёсць свая логіка і прыгажосць, падкрэслівае Сяргей Сергачоў.

Лямус у Гродне стаяў запусцелы каля 30 гадоў. Нейкі час ён быў прыстасаваны пад жытло, аб чым сведчыць печ. Верагодна, яе дабудавалі пасля адыходу адсюль манахінь у 50-я гады.

Налета плануецца завяршыць рамонтныя работы. Новы выгляд дэталяў будзе максімальна набліжаны да арыгінала — вокны, дзверы, падлога. Гэта будзе карпатлівая праца, і ўжо ёсць дамоўленасць з майстрам, які гэта зробіць. Нават дах заменяць такой жа дранкай, якая была раней. Праект рэканструкцыі вядзецца ў рамках пагаднення паміж міністэрствамі культуры Беларусі і Польшчы. Сродкі выдзяляюцца польскім Міністэрствам культуры і нацыянальнай спадчыны і гродзенскай каталіцкай дыяцэзіяй. Работы вядуць беларускія будаўнікі сумесна з польскімі спецыялістамі.

— Гэта складаны аб'ект, — адзначае Алена Шчасная, — бо ён такі адзін на ўсю Беларусь. Гэта будынак-экспанат. Да таго ж мы павінны даць яму новае прызначэнне і захаваць былую веліч.

Як паведаміў **ксёндз Гродзенскай каталіцкай епархіі Аляксандр САСНОЎСКІ,** у лямусе будзе размешчана музейная экспазіцыя гісторыі Гродзенскай епархіі з розных касцёлаў — кнігі, службовае адзенне святароў, начынне храмаў.

Паступова манастырскаму корпусу будзе вернуты былы выгляд. Прадоўжыцца аднаўленне мураванай агароджы з вежамі па вуглах. Дзве аналагічныя вежы захаваліся на вуглах комплексу па вуліцы Карла Маркса. А вось адзін з будынкаў, прыбудаваны да манастырскай агароджы ў XX стагоддзі, плануецца разабраць. На яго месцы зробяць уезд і ўваход. Сюды змогуць пад'ехаць аўтобусы з турыстамі. Запусцелы ландшафт двара зменіць манастырскі сад. Наведванне музея і тэрыторыі манастыра — праект не камерцыйны, запэўніў ксёндз. І выставы, і лямус будуць даступныя кожнаму наведвальніку.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
margo@zviazda.by

У тэму

Брыгіцкі манастыр пабудаваны ў стылі барока ў XVII стагоддзі. Доўгі час насельніцамі яго былі сёстры ордэна шведскай святой Брыгіты. У пачатку XX стагоддзя комплекс перадалі манахіням-назарацянкам. Многія гродзенцы атаясамліваюць будынак манастыра з клінікай для душэўнахворых, якая тут месцілася больш за 40 гадоў. Толькі ў 90-я комплекс вярнулі Гродзенскай дыяцэзіі, пасля чаго апошняя ўзялася за рамонт памяшканняў былой клінікі. Хоць манастырскія памяшканні апусцелі, брыгіцкі касцёл не спыняў сваёй дзейнасці. Дарэчы, гэта адзіны храм у Гродне, дзе службы вядуцца на беларускай, літоўскай, польскай і англійскай мовах. Таксама ёсць служба для глуханямых. Галоўнай святыняй касцёла з'яўляюцца мошчы святога Клімента, рымскага салдата, які загінуў у IV стагоддзі. Доўгі час гараджане лічылі яго нябесным апекуном Гродна.

Радкі смутку — радкі славы



У адным паэтычным альманаху сустрэліся паэты Расіі і Беларусі з вершамі пра Вялікую Айчынную вайну.

У Маскве пабачыў свет спецыяльны выпуск паэтычнага альманаха-навігатара «Паровозъ» — «Бронецягнік Перамогі». Укладальнікі сабралі разам пранізлівыя, шчырыя вершы пра вялікую вайну. Адметна, што сярод іншых твораў — і паэтычныя споведзі творцаў, чый лёс у 1941—1945 гадах быў звязаны з чужбінай. Ёсць і вершы дзяцей вайны. Унікальны кніжны праект рэалізаваны з падтрымкі Саюза расійскіх пісьменнікаў.

Пад адной вокладкай — вершы Іосіфа Уткіна, Ілы Эрэнбурга, Арсенія Таркоўскага, Міхаіла Матусоўскага, Мікалая Грыбачова, Цэзара Саладара, Сямёна Ліпкіна, Васіля Субоціна... Шмат хто з аўтараў ваяваў з фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Беларусі. У кнізе — і вершы паэтаў, якія нарадзіліся і жылі ў Беларусі: Анатоля Сафронава, Аляксандра Валодзіна, Дзмітрыя Кавалёва, Уладзіслава Арцёмава, Пятра Кошаля, Міхаіла Шэлехава. Такі «Бронецягнік...» — добры мастацкі падарунак юбілею Вялікай Перамогі ў 2020 годзе. Ёсць яшчэ час і для стварэння беларускай паэтычнай анталогіі ў знак памяці пра пакаленне пераможцаў, пакаленне пакутнікаў і ахвяр. Радкі, створаныя беларускімі паэтамі-франтавікамі Аркадзем Куляшовым, Піменам Панчанкам, Алесем Бачылам, Максімам Танкам, Аляксеем Пысіным, — радкі для вечнасці.

Сяргей ШЫЧКО.

■ Ну і ну!

Мінчанін нападпітку пашкодзіў пяць аўто

Позна ўвечары ў сталічную міліцыю паступіла паведамленне, што на вуліцах Ландэра і Казінца невядомы пашкоджвае аўтамабілі. Праваахоўнікі неўзабаве ўстанавілі асобу зламысніка. Гэта быў 24-гадовы раней судзімы жыхар горада.

Па інфармацыі Кастрычніцкага РУУС г. Мінска, у маладога чалавека, які знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення, узнік канфлікт з невядомымі яму людзьмі каля крамы. Падчас высвятлення стасункаў хлопец зняў з сябе заплечнік і кінуў яго ў дзверы гандлёвага аб'екта, разбіўшы шкло. Пасля гэтага ён збег на дваровую тэрыторыю. Менавіта там ён пашкодзіў некалькі аўтамабіляў. Матывы свайго ўчынку малады чалавек растлумачыць не змог. Заведзена крымінальная справа за хуліганства.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ХАМАС аб'явіў аб пачатку інтыфады з-за рашэння Трампа па Іерусаліме

Палесцінскі рух ХАМАС абвясціў аб пачатку трэцяй інтыфады, паведаміў прэс-сакратар руху Абдулатыў Алкану.

«Мы абвясцілі аб пачатку трэцяй інтыфады, каб пратэсты працягваліся і каб зрабіць ціск на ЗША, каб яны адмянілі сваё рашэнне. У сектары Газа акцыі пратэсту растуць у рамках пачатку інтыфады. Гэта трэцяя інтыфада», — заявіў Алкану РІА «Навіны». Акрамя таго, адзначаецца, што рух чакае паўтарэння «дня гневу».

Аб поўным спыненні мірнага працэсу на Блізкім Усходзе ХАМАС заявіў пасля таго, як прэзідэнт ЗША Дональд Трамп распарадзіўся аб пераносе пасольства Злучаных Штатаў з Тэль-Авіва ў Іерусалім і прызнаў гэты горад сталіцай яўрэйскай дзяржавы. Лідар руху Ісмаіл Ханія заклікаў палесцінцаў да паўстання.

У Палесціне ўспыхнулі масавыя хваляванні і сутычкі арабскага насельніцтва з ізраільскімі сілавікамі. Пацярпелі сотні людзей. Пачасціліся і выпадкі ракетнага абстрэлу бакамі.

Інтыфада — арабскі баявы рух, накіраваны на захоп тэрыторыі Палесціны. Першая палесцінская інтыфада — паўстанне палесцінцаў у перыяд з 1987-га па 1991 год, мэтай якога была абвешчана барацьба супраць ізраільскай акупацыі тэрыторый, заваяваных у ходзе Шасцідзённай вайны 1967 года. Нагодай для пачатку другой інтыфады стала наведванне прэм'ерам Ізраіля Арыэлем Шаронам і групай ягоных паплечнікаў Храмавай гары ў 2000 годзе.

У Польшчы зацверджаны новы ўрад

Сейм Польшчы прагаласаваў за зацвярджэнне новага ўрада краіны на чале з прэм'ер-міністрам Матэвушам Маравецкім.

На мінулым тыдні прэзідэнт Польшчы Анджэй Дуда прыняў адстаўку прэм'ера Беаты Шыдла разам з усім урадам, які працаваў з восені 2015 года пасля перамогі кіруючай у краіне партыі «Закон і справядлівасць» на парламенцкіх выбарах.

Матэвуш Маравецкі ў сваёй праграмнай прамове заявіў, што яго кабінет будзе працягваць сацыяльна арыентаваную праграму партыі і зробіць стаўку на эканамічнае развіццё. Галоўнымі саюзнікамі Польшчы на міжнароднай арэне ён назваў ЗША і НАТА, выступіўшы за пашырэнне супрацоўніцтва з Вышаградскай групай, а таксама Украінай, Грузіяй і Літвой, «калі яны таксама зробяць крокі для выбудоўвання двухбаковых адносін».

У Японіі назвалі іерогліф — сімвал адыходзячага года

Іерогліф са значэннем «поўнач» стаў сімвалам 2017 года ў Японіі. Інфармацыя была агучаная ў эфіры тэлеканала NHK. Адзначаецца, што гэты выбар звязаны з ракетнымі выпрабаваннямі КНДР, якія выклікалі вялікую занепакоенасць у японцаў. У 2016-м сімвалам стаў іерогліф са значэннем «грошы». Іерогліф «танны» быў сімвалам 2015 года. Сімвалам 2014-га стаў іерогліф «падатак». У 2013-м сімвалам года назвалі іерогліф «кольцы» ў сувязі з тым, што Токіа атрымаў права прыняць Алімпійскія гульні 2020 года.

Іерогліф, які адлюстроўвае найважнейшыя падзеі адыходзячага года, у Японіі называюць з 1995 года.

ЧАЛАВЕК, ЯКІ ПАБУДАВАЎ ЗАВОД

Аляксандр БАДЗЯКА звяртае ўвагу, што бусел «Тэхналіта» абляцеў увесь усход і ляціць на захад — прадукцыя магілёўскага прадпрыемства запатрабавана і там.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Напэўна, таму вы так лёгка з супрацоўніка Інстытута тэхналогіі металаў НАН Беларусі пераквалі-фікаваліся ў прамыслоўца?

— Тыя веды, якія я напрацаваў за гады работы ў сістэме Акадэміі навук, дапамаглі і дапамагаюць усё маё вытворчае жыццё. Чаму пайшоў з навукі, пытанне вельмі складанае. Не столькі таму, што ў пачатку «нулявых» было цяжка грошы зарабіць, проста шмат чаго стала ператварацца ў фармальнасць. Акадэмічная навука павінна цалкам фінансавацца з бюджэту, а ў той час на яе выдзялялася толькі 25—30% неабходных на ўтрыманне лабараторыі і персаналу грошай. Астатнія прыходзілася зарабляць на гаспадарча-дагаворных работах. У такіх умовах нельга развіваць акадэмічную навуку. Розум толькі тады ў стане генерыраваць думкі, калі ён вольны ад гаспадарчай руціны. Навуковец — гэта мысліцель. Ён не павінен залежаць ад заробку, нейкіх інструкцый, пастаноў. Большая частка думак, якія мне пашчасціла матэрыялізаваць, наогул прыходзіла пад раніцу, калі мозг адпачыў ад руціны.

Што датычыцца завода, то тэхналогія ліцця чыгуну метадам намарожвання была распрацаваная яшчэ да мяне, я падключыўся на стадыі, калі яе спрабавалі ўкараняць у прамысловасць. Яна праходзіла выпрабаванні на розных прадпрыемствах, і не толькі магілёўскіх, але была настолькі радыкальна новай, што яе проста не разумелі. Ніхто не ведаў, як апрацаваць адліўку, бо гэта быў новы прынцып крышталізацыі. Мне стала шкада ўсё проста так кінуць, і я сам узяўся за гэтую справу. Было так цяжка, што словамі не перадаць. Прыйшлося ўзяць 8 ліцэнзій Праматамнагляду для таго, каб справа зварухнулася з месца. Ніхто не хацеў брацца праектаваць, будаваць, манціраваць новую прамысловасць. Цяпер сам здзіўляюся, як я ўсё гэта змог зрабіць. Без грошай, без сувязяў. Прэзідэнт летась спытаўся, чаму мы так доўга развіваліся? Што мне было на гэта сказаць? Тое, што ў ідэі грошы ніхто не ўкладае? А без грошай і маёмасці ніводны банк не дае крэдыт.

— Але ж ваш, можна сказаць, грамадзянскі подзвіг быў адзначаны высокай узнагародай.

— Так. Менавіта за гэтую распрацоўку і ўкараненне яе на «Тэхналіце» я і яшчэ два супрацоўнікі Інстытута тэхналогіі металаў НАН Беларусі — акадэмік Яўген Мануковіч і кандыдат тэхнічных навук Уладзімір Беўза — у 2010 годзе атрымалі дзяржпрэмію ў галіне навукі і тэхнікі. Уся наша прадукцыя імпартазамяшчальная. Дэталі з чыгуну, атрыманага метадам намарожвання, у 30 разоў трывалейшыя за аналагі з больш дарагіх сплаваў. На іх зрабілі стаўку ўсе машынабудаўнічыя заводы Беларусі і Расіі. Для БелАЗа вырабляем камплектуючыя, дзе замянілі нашымі чыгунамі сталь і бронзу, атрымаўшы каласальны эканамічны і тэхнічны эфект. Працуем з МАЗам, Барысаўскім заводам агрэгатаў, Мінскім трактарным заводам і іншымі. Робім шмат камплектуючых для рухавікоў спецыяльнай тэхнікі, для марскіх суднаў, лакаматываў для чыгункі. На постсавецкай прасторы мы адзіны пастаўшчык кольцаў для турбакампрэсараў, якія рабіліся спецыялізаванымі заводамі. Мы ўсіх іх з рынку выціснулі.

— Ад чаго залежыць формула паспяховасці? І адкуль наогул бяруцца ўнікальныя ідэі?

— Адзін з самых эфектыўных, калі не самы эфектыўны метад пазнання, гэта тое, што ты пачуў ад больш дасведчанага спецыяліста. А вось электронныя сродкі інфармацыі, якімі зараз так актыўна ўсе карыстаюцца, гэта не што іншае як адурманьванне мас. Лепшай крыніцы, чым кніга або часопіс, няма. Але сёння ўжо ніхто ў даведнікі не заглядвае. Людзі лічаць, што гэта ім не патрэбна. Але, што можна зразумець, пачытаўшы інфармацыю ў інтэрнэце? Калі мы карысталіся літаратурай, я ішоў у бібліятэку, канспектаваў, гэта надоўга адкладвалася ў галаве. Трэба столькі загнаць рознай інфармацыі, каб мозг пачаў яе абагульняць. І, абагульняючы, выдаваў новыя творчыя ідэі. І тады адбываецца тое самае, пра што так добра сказаў Пушкін: *«О, сколько нам открытий чудных / Готовят просвященья дух / И опыт, сын ошибок трудных, / И гений, парадоксов друг, / И случай, Бог изобретатель»*. Які ж ён разумнік гэты Пушкін, як тонка ўсё заўважыў. Менавіта выпадак — Бог вынаходнік. Гэта тое, пра што я казаў: спачатку веды ўкласці, а потым выпадак і — адкрыццё. Ты нешта ўбачыў — і прарвала. Вось яно вынаходніцтва.

— Кіраўнікі вядучых прамысловых прадпрыемстваў часта скардзяцца, што не хапае тэхнічна дасведчаных кадраў.

— Я даўно разумеў, што іх табе ніхто не дасць, таму вырасціў сам. З трэцяга курса бяром на практыку студэнтаў. Яны пішуць курсавыя, дыпломы. Прэстыж ісці ў навуку прапаў. Я тут кардынальна ўсё перайначыў бы. У тэхніцы замест дысертацыі павінен быць навуковы даклад па выніках нейкай тваёй распрацоўкі. Проста ідэю ў кагосьці злізаў, дадумаў, зрабіў. Што такое навука? Гэта новыя веды. Дапоўніў, дапрацаваў — важны вынік. Столькі фармальнасцяў, апускаюцца рукі.

— Раней кузняй высокакваліфікаваных кадраў для тэхнічнай прамысловасці быў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, цяпер БРУ (Беларуска-Расійскі ўніверсітэт). Узровень той падрыхтоўкі застаўся?

— Не кажыце пры мне гэтую непрыстойную абрэвіятуру — БРУ. Гэта чарговае глупства. Пра што гэты ўніверсітэт? Тэхнічны? Педагагічны? Дзе гэта бачна? Гучала прыгожа — машынабудаўнічы інстытут. Калі працаваў у навуковым інстытуце і шмат ездзіў па розных навуковых установах і прадпрыемствах Савецкага Саюза, мой дыплом аб заканчэнні гэтага машынабудаўнічага інстытута заўсёды каціраваўся вельмі высока. Гэта была шырока прызнаная навукова-будаўнічая школа. Зараз нават назву яго дэвальвавалі. У навуцы нельга грэбаваць імем. Як вы лодку назавяце, так яна і паплыве.

Розум толькі тады ў стане генерыраваць думкі, калі ён вольны ад гаспадарчай руціны.

— А што трэба, каб навуку падняць на вышэйшы ўзровень?

— Нехта з амерыканскіх прэзідэнтаў сказаў: мы так шчодра фінансуем навуку не таму, што багатыя, мы багатыя таму, што так шчодра фінансуем навуку. Гэта вельмі важна. Паглядзіце на гісторыю той жа японскай станкабудаўнічай кампаніі Mazak. Яе гаспадар расказваў, што пасля Другой сусветнай вайны, калі востра стаяла неабходнасць аднавіць эканоміку краіны, ён дабіўся прыёму ў прэм'ер-міністра і сказаў яму, што ведае як рабіць станкі і можа арганізаваць іх вытворчасць. У яго было невялікае рамеснае прадпрыемства, але яму паверылі. І — дапамаглі. Сёння на такіх кампаніях, як Mazak, трымаецца ўвесь бюджэт Японіі. І ніхто не баіцца, што яна прыватная, а не дзяржаўная. Галоўнае, што ты робіш і наколькі гэта запатрабавана.

— Ці шмат у Магілёве прадпрыемстваў, якія робяць стаўку на навуку?

— Супрацоўнічаем з ліфтабудаўнічым заводам. Разам аналізуем, як можна прымяніць нашы распрацоўкі. На БелАЗе вельмі моцная канструктарская школа. Завод будаваўся з нуля, як той казаў, у чыстым полі. Там сфарміравалася каманда тых, хто сам імкнуўся наперад. Такой канструктарскай школы, як на гэтым прадпрыемстве, няма нідзе. Я імі захапляюся. З ідэі нарадзілася прадпрыемства па вытворчасці шкла «Кува». Мы з яго кіраўніком працавалі ў суседніх інстытутах, прайшлі амаль аднолькавую сцежку, пачыналі з нуля і працавалі на голым энтузіязме. Але такіх прадпрыемстваў, на жаль, у нас няшмат.

— Лібералізацыя бізнесу ў эканоміцы Беларусі, пра якую зараз так шмат гавораць, неяк дапаможа становішчу?

— За маю багатую вытворчую дзейнасць наглядзеўся ўсякіх лібералізацый. Напрыклад, у ліцейнай вытворчасці выдаваліся ліцэнзіі на 5 гадоў. Цяпер іх адмянілі, і працаваць стала нашмат горш. Нарматыўную базу адмянілі разам з ліцэнзіяй, і зараз мы нават не ведаем, за што адказваем. Была ліцэнзія, усё было распісана, я нешта парушыў — у мяне яе забралі. Цяпер увялі Дэкларацыю прамысловай бяспекі. Крытэрыі дзе? Кажуць, у свеце. Дзе ў свеце? А як быць тым, у каго, як у нас, аналагаў вытворчасці няма? Таму, калі я чую пра чарговую лібералізацыю, асабіста не чакаю нічога добрага. Па вопыце ведаю, абрасце іншымі інструкцыямі.

— Але ж вы ўсё адно працягваеце працаваць на карысць менавіта беларускай эканомікі. Хоць, напэўна, былі прапановы рэалізавацца дзесьці ў іншых краінах.

— Не буду ўтойваць, мяне запрашалі ў Еўропу, яшчэ часцей у Расію. Магчыма, гэта прагучыць пафасна, але чалавек павінен тварыць там, дзе нарадзіўся. Мае дзеці са мной засталіся. Наконт малодшага Канстанціна нават сваркі з жонкай былі. Але я настаяў на тым, што ён павінен вучыцца і працаваць тут. Старэйшы Андрэй наогул мог зрабіць кар'еру артыста. Музыку пісаў, голас прыгожы. Жонка перыядычна наракае, што я не даў яму рэалізаваць яго задаткі. Але ён сам сёння мне за гэта ўдзячны. Займаецца сур'ёзнай справай, кантралюе на «Тэхналіце» ўвесь тэхнічны працэс. А спяваць працягвае ў сваё задавальненне. Затое, калі на нейкіх прадстаўнічых форумах здараецца бліснуць сваім талентам, усе ў захапленні. Не часта такое можна ўбачыць, каб тэхнар яшчэ і спяваў.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

КЛІЕНТ ЗАЎСЁДЫ ДОЙДЗЕ ДА ЗДЗЕЛКІ — З ВАМІ ЦІ БЕЗ

Некалькі парад прадпрымальнікам ад вядомага расійскага практыка

Не так даўно перад беларускай аўдыторыяй выступіў паспяховы расійскі бізнесмен Вадзім ДАЗОРЦАЎ — стваральнік і саўладальнік кансалтынгавай кампаніі і аўтар збытавай тэхналогіі. Спікер падзяліўся сакрэтамі пошуку новых кліентаў, а таксама расказаў пра тое, як укараняць змены ў кампаніі. Вось некаторыя цікавыя моманты з яго выступу.

Як прымусіць карыстальніка зрабіць наступны крок

Кожны кліент праходзіць некалькі этапаў на шляху да згоды на здзелку: цікавасць, жаданне, вывучэнне, параўнанне і непасрэдна дзеянне — само заключэнне. Вялікую частку ў гэтым ланцужку займае стварэнне кампаніяй кантэнту, які прыцягвае новых кліентаў.

— Рэклама «ў лоб» ужо нікому не цікавая. Сёння кампаніі збольшага ператвараюцца ў медыя, у іх фарміруецца нейкая рэдакцыя па стварэнні кантэнту, які распаўсюджваецца ў розных каналах — СМІ, блогах, сацыяльных сетках, на афлайн-мерапрыемствах. Але ёсць два важныя нюансы. Першы — кантэнт павінен быць цікавым, а ваша кампанія павінна стаць маленькім Галівудам. Другі нюанс — кантэнт павінен быць рэгулярным. Выконваць гэтыя два правілы могуць сабе дазволіць далёка не ўсе кампаніі.

Не трэба нервавацца

— Кліент дойдзе да здзелкі заўсёды — з вамі ці без вас. Пры гэтым яго «падарожжа» можа быць складаным і ірацыянальным. Многія з вас заўважалі, што на нейкім этапе ўзаемадзеянне з кліентам спачатку спыняецца, а потым — і зусім адкочваецца назад. Трэба проста ўзяць і перастаць з гэтай нагоды нервавацца.

Прывяду прыклад. У 2013 годзе мы дамовіліся з уладальнікам адной расійска-нямецкай кампаніі аб тым, што ў нас з імі будзе праект. Справа адбывалася ў канцы года, перад каляднымі святамі, і ён запэўніў нас, што мы можам рыхтаваць усе дакументы, ён вернецца з адпачынку і ўсё падпіша. Прайшло два тыдні, тэлефануем — яго няма, потым нас пачалі перакідваць ад аднаго супрацоўніка да іншага, у выніку — мы так нічога і не дамагліся. Увогуле кліент «знік».

Праз два гады ўладальнік гэтай кампаніі прыйшоў да нас на бізнес-сняданак, падышоў да маёй памочніцы і сказаў: «Я гатовы, робім праект». Мы ўсё падпісалі за тры дні, і праз тыдзень стартавалі. Цяпер — гэта адзін з найлепшых нашых кліентаў. Дзе ён быў два гады — мы нават не спрабавалі высвятляць.

Ці можна застрахаваць сябе ад рызык, звязаных з такімі дзіўнымі паводзінамі кліента? Так. У вас заўсёды павінен быць спіс альтэрнатыў.

Боль і мара

— Цяпер модна казаць: «Мы ведаем «боль» кліента і рэагуем на яго». Але не ўсе ж кліенты «хварэюць». Ёсць кліенты, якія... мараць.

У чым розніца паміж «болем» і «марай»? Калі кліент прыходзіць да вас з «болем», то з ім не трэба весці доўгія размовы, высвятляць прычыны. Калі ў яго «боль» — ён трызніць. Прывяду прыклад.

Прыходзіць да нас кліент і кажа: «У мяне праблема, дрэнная матывацыя персаналу. Трэба выправіць матывацыйную схему ўзнагароджання». Мы сталі тлумачыць, што матывацыя — гэта элемент кіравання, які завязаны на планаванні, кантролі... І гэтак далей. Уявіце, да доктара прыйшоў чалавек з адкрытым пераломам, а яму прапануюць супакоіцца, памераць ціск, здаць усе аналізы, зрабіць МРТ...

У выніку кліент ад нас пайшоў. Выснова: «боль» трэба суняць, і рабіць гэта хутка.

Людзей не зменіш за два тыдні

— Нельга нахрапам за тыдзень усё змяніць, вы працуеце не з праграмай — а з людзьмі, іх звычкамі і натурай. Таму да змен трэба рыхтавацца, гэта доўгая гісторыя.

Прывяду прыклад. Зараз вельмі модна — у добрым сэнсе — дзяліць ролі па працэсе. Патрабаванні да прадаўца моцна ўзрастаюць: кліенты сталі вельмі прасунутымі, прадукты складанымі. Дамагчыся ўніверсальнасці ад прадаўца калі і можна, то вельмі дорага.

Таму ў многіх кампаніях прадаўцоў сталі дзяліць на «паляўнічых» і «фермераў». «Паляўнічыя» здабываюць новых кліентаў, «фермеры» — развіваюць дзеючых. І часта такі падзел праводзіцца ў кампаніі без належнай падрыхтоўкі. Прыходзіць начальнік у аддзел продажаў і кажа: «З панядзелка вы — «фермеры», а вы — «паляўнічыя». Мяняйцеся кліентамі». У лепшым выпадку ён можа спытаць, хто кім хоча быць.

І вось сітуацыя. «Паляўнічы» крывёю і потам за паўгода атрымлівае важнага кліента. Дабіваецца яго і думае: «А вось аддам цяпер кліента «фермеру» — і ён яго страціць. Пакіну я яго пакуль сабе». Аднаго пакідае, другога, трэцяга. У гэты час «фермер» недаатрымлівае кліентаў і, адпаведна, бонусаў. І пачынае таемна выходзіць на «паляванне».

Як можна было б пазбегнуць такой сітуацыі? Правесці падрыхтоўку і распрацаваць для «паляўнічых» такую сістэму матывацыі, пры якой яны аддаюць кліента і атрымліваюць бонусы за яго яшчэ, скажам, паўгода. Заўсёды прыемна атрымліваць заахвочванні і ні за што не адказваць.

Супрацоўнікаў трэба вучыць

— Кіраўнік павінен разумець, што зменам людзей трэба навучыць. Не варта спадзявацца, што яны самі разбяруцца, прымуць іх. Калі вы хочаце ад супрацоўнікаў справаздач у CRM-сістэме, іх трэба навучыць рабіць гэтыя справаздачы.

Прыклад з практыкі. Кампанія — паліграфічны комплекс. Камерцыйны дырэктар сам вельмі класны прадавец, у падначаленні ў яго 14 супрацоўнікаў. Але яго пазіцыя такая, што супрацоўнікі павінны самі вучыцца. «І наогул — хай падносяць мне снарады, а я буду рабіць здзелкі». Снарады яны падносяць, здзелкі ён заключае, толькі вось магутнасці кампаніі загружаныя на 45 працэнтаў. А 14 чалавек так нікуды і не растуць.

Не спяшайцеся з ідэямі

— У кіраўнікоў вельмі хуткае мысленне. І часта бывае так: толькі-толькі паставілі калектыў на новыя рэйкі, а ў начальніка ўжо з'явілася чарговая ідэя. Але змены — гэта стрэс. Супрацоўнікам трэба даць час папрацаваць у спакойным рэжыме. Таму новую ідэю проста запішыце ў нататнік і на якісьці час адкладзіце ў стол.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

Сямейная газета

Выпуск №23 (90)

ТЭЛЕФОННАЯ ДЫЕТА

Хадзілі з мужам у Купалаўскі тэатр на «Школу пададаткаплацельшчыкаў». За пяць хвілін да заканчэння антракту вярнуліся на свае месцы на балконе. Зірнулі ўніз — а там свецяцца сотні экранаў мабільных тэлефонаў. Калі шчыра, у тэатры я такога ўбачыць не чакала. На спектаклі ж практычна ўсе прыходзяць парамі. Антракт — самы час абмеркаваць убачанае. Але людзі штосьці старанна шукалі ў сваіх тэлефонах. Забываліся на галоўнае: усё, што важна, адбываецца побач з намі.

— Мам, так немагчыма гуляць! Ты быццам бы са мной, але раптам камусьці па тэлефоне адказала, зараз ты Ані па ўроках штосьці сказала. Так нельга ў гульні!

— Чаму?! Гэта ж жыццёва. Гульня ж сапраўдная, як у жыцці.

— Не!!! Калі гуляеш, ты нічога не заўважаеш, ты проста гуляеш і н-а-с-а-л-о-д-ж-в-а-е-ш-с-я!!!

А нядаўна ў Фэйсбуку з'явілася чыстасардэчнае прызнанне маёй аднагрупніцы. «Злы вірус, практычна на тыдзень выпала з жыцця. Краем вока (левым, бо правае запаленае і чырвонае) ад няма чаго рабіць назіраю, як паралельна вакол бурліць віртуальнае жыццё. І ў мяне проста перадоз ад чужых фотаздымкаў, ад патоку ўваходных паведамленняў. Хачу ўзяць сабе за правіла адкрываць сацсеткі толькі ў вызначаны час. А што прайшло незаўважаным — значыць няважна. Усё, з сённяшняга дня тэлефонная дыета! Мне не падабаецца, што гэта прамавугольная штука захоплівае вялізны кавалак майго рэальнага жыцця». А ў якасці напаміну сабе і астатнім Алеся прымацавала кранальны ролік. Яго, на маю думку, абавязана паглядзець не толькі кожная сучасная мама, але і тата.

Пачынаецца той ролік з таго, што маладая жанчына перад навагоднім ранішнікам прасуе сукенку для дачушкі і пры гэтым размаўляе па тэлефоне. Дзяўчынка ў гэты час сядзіць побач на канапе і сумуе. За абедам мама замест таго каб паўтарыць вершык з малой, не адрывае вачэй ад манітора ноўтбука. Пакуль едуць на ранішнік, таксама штосьці чытае ў мабільным...

«А зараз верш прачытае Машачка Іванова». Мама падрыхтавалася запісваць выступленне дачушкі на мабільны тэлефон. Дзяўчынка пачынае чытаць завучаныя радкі пра зіму... «Вольга Пятроўна, — раптам звяртаецца да выхавальніцы, — можна я іншы вершык раскажу».

«Мама дома, мамы нет, мама вышла в интернет. / Мама смотрит в интернете, как дела на белом свете. / Кофе пьет, глазами водит, что там в мире происходит. / Мама, я тебе скажу: в мире я происхожу!!!»

Гэты ролік паглядзела ўжо шмат маіх знаёмых. Адна з іх кажа, што яе муж цяпер жартуе: «Даша дома, Даши нет, Даша вышла в интернет». Смех смехам, але мне чамусьці ўспомнілася гісторыя двухгадовай даўнасці. Памятаеце, як жыхарку Баранавіч пазбавілі бацькоўскіх правоў з-за празмернага захаплення камп'ютарам. Не, яна не злоўжывала алкаголем, як гэта часта бывае. Проста дні і ночы напралёт сядзела ў сацыяльных сетках. Пры гэтым зусім не клапацілася пра сына. Магла нават забыцца разбудзіць яго ў школу. Зімой хлопчык мог прыйсці на ўрокі ў лёгкай кофце без майкі, абутак не заўсёды быў па сезоне. І ўсё гэта — з-за інтэрнэт-залежнасці... Калі шчыра, у галаве не ўкладваецца, як інтэрнэт можа быць даражэйшы за ўласнае дзіця...

— Мама, я хачу піць. — Пачакай, я занятая.

— Мамачка, давай пагуляем. — Пагуляй сам, мне няма калі.

— Мамачка, паглядзі. — Не замінай, не да цябе цяпер. Будзеш ныць, без падарунка застанешся...

На носе Каляды і Новы год. Клапатлівыя бацькі старанна рыхтуюць сваім дзецям падаруначкі пад ёлку. Гэта несумненна цудоўна. Але не варта забывацца за ўсёй перадсвяточнай мішурой, што самы каштоўны падарунак — час, праведзены з тымі, хто побач.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
nadzieja@zviazda.by

■ Тыя, хто побач

«АПОШНІ РАЗ СВАРЫЛІСЯ ЯШЧЭ ДА ВЯСЕЛЛЯ»

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Ва ўтульнай кватэры Надзі і Гены Букаў, акрамя двух сыноў Жэні ды Яна, жыве Піглас. Прычым не адзін. Іх шмат — на шпалерах, карцінах, мальберце і нават у Надзі на спіне ў якасці татуіроўкі. Мастачка выдумала гэтага казачнага героя ў выглядзе вока з крыламі ўжо даўно (спачатку Піглас з'явіўся на карцінах Надзі. Пасля яна напісала пра яго дзіцячую кнігу «Бася і Піглас». — Аўт.). Кажа, што ён не толькі дарыць натхненне, але і аберагае закаханыя пары. Калі тыя сварацца, пранікае ў галаву да віноўніка разладу і пачынае лёгенька яго дзяўбсці. «Мы думаем — гэта згрызоты сумлення, а вось і не — Піглас», — смяецца Надзя, якая называе сябе каралевай Пігласаў.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

■ У кабінеце стаматолага

ЗУБ ДАЮ,

або Уся праўда пра карыес, жуйкі ды адбельванне

Звычайна зубны боль пачынаецца ў самы нязручны момант: падчас важнай паездкі ці 31 снежня, незадоўга да бою курантаў. Што рабіць, калі магчымасці звярнуцца да доктара ў гэты момант няма? Наогул колькі часу ў суткі трэба прысвячаць сваім зубам? І чаму маладым бацькам так важна сур'ёзна ставіцца да першага паходу з дзіцем да стаматолага? Пра гэта і не толькі размаўляем з чалавекам, які штодзень заляпляе дуплы ды наводзіць масты, старшым выкладчыкам Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта па сумяшальніцтве Аляксандрам ФІСЮНОВЫМ.

«Трэба выбіраць не месца, а доктара»

— Пачну інтэрв'ю з анекдота: «— Як знайсці добрага стаматолага? — Шляхам спроб, але запомні: у цябе толькі 32 спробы». Аляксандр, цяпер багаты выбар як дзяржаўных, так і прыватных стаматалагічных клінік. Як не памыліцца з выбарам?

— Трэба выбіраць не месца, а спецыяліста. Бо ў раённай паліклініцы можа аказацца стаматолаг з залатымі рукамі. А ў дарагім прыватным кабінеце — доктар, у якога з гэтымі рукамі вялікія праблемы. Не варта спакушацца на рэкламу «ў нас самае сучаснае абсталяванне і прывабныя цэны». Лепш кіруйцеся «сарафанным радыё» — не прагадаеце.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

■ Дыскусія

ЧАГО ХОЧА КАНТРАЛЁР?

Спрэчныя моманты апекі дзяцей

«Я прыходзіла з работы, падала на канапу і раўла. Не ад болю — ад бяссілля». Гэта словы маці, дзіця якой жыве ў прытулку, бо камісія палічыла, што сям'я знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Гісторыя жанчыны стала асновай для дакументальнага фільма, які ўбачылі ўдзельнікі круглага стала «Гіперахова праблемных сем'яў. Як пазбегнуць канфліктаў паміж чыноўнікамі і бацькамі?» Безумоўна, практыка правяраць сем'і, якія выклікаюць трывогу, арганізавана з добрых памкненняў. Існуюць сітуацыі, калі малому насамрэч лепш трапіць у прытулак. Гэта шанц для яго апынуцца ў прымальных умовах, калі вакол няма п'яных сварак і пастаяннай нястачы. У той жа час і для гора-бацькоў адыманне дзіцяці з'яўляецца апошняй перасцярогай, каб задумацца і выправіць становішча. Аднак не ўсе бацькі вядуць антысацыяльны лад жыцця. Цяжкія абставіны, хвароба ці пошук работы могуць прывесці да сітуацыі, якую іначай, чым «не пашчасціла», не ахарактарызуеш. Дзе праходзіць мяжа паміж жаданнем бацькоў захаваць сям'ю і імкненнем чыноўнікаў абараніць дзяцей ад неспрыяльных умоў?

КАЛЯ РАЗМЫТЫХ БЕРАГОЎ

Адзін са спрэчных момантаў датычыцца акта па выніках праверкі ўмоў жыцця. Гэта дакумент, дзе камісія ацэньвае бытавыя і псіхалагічныя ўмовы, у якіх выхоўваецца непаўналетні.

— Уся бяда ў тым, што крытэрыі, каб прылічыць сям'ю да сацыяльна небяспечнага становішча, размытыя, і калі прыдзірліва ставіцца да кожнай дробязі, то многія «беспраблемныя» сем'і раптам могуць трапіць на ўлік, — разважае **кіраўнік рабочай падгрупы па правах сям'і і дзяцей Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства Леанід СКАРАБАГАТЫ.**

Абследаванне сям'і можа адбывацца не толькі па запыце суда, міліцыі, паліклінікі, разлікова-даведачнага цэнтра, але, напрыклад, і пасля сігналу — паведамлення ад пабочнай асобы. Абмежаванняў па колькасці праверак няма. Умоўна кажучы, у адзін дзень да сям'і могуць завітаць прадстаўнікі навучальнай установы, назаўтра — спецыялісты аддзела адукацыі, а яшчэ праз суткі — камісія з медыцынскай установы. Подпіс асоб, дом якіх наведвала камісія, у акце праверкі не прадугледжаны. Адсюль — можна не паказваць дакумент бацькам, і апошнія ніколі не даведаюцца, што там напісана. Як вынік, яны не змогуць выправіць вынайдзеныя парушэнні або аспрэчыць рашэнне камісіі. Першапачаткова акт праверкі лічыўся службовым, ад таго недаступным для прагляду. Цяпер статус дакумента змяніўся на «да запатрабавання». Такім чынам, бацькі могуць напісаць запыт і азнаёміцца з вывадамі правяраючых асоб.

— Праблема большасці бацькоў — нізкая юрыдычная дасведчанасць, — лічыць **юрыст і прыёмная маці Алена КАШЫНА.** — Я рэкамендавала б усім шматдзетным сем'ям або сем'ям, якія стаяць на ўліку сацыяльна небяспечнага становішча (далей — СНС), штомесячна рабіць запыт на копію акта праверкі і потым захоўваць адказы, каб абараніць сябе ад магчымых непрыемнасцяў.

МЫ ПРЫЙШЛІ ВАС ПАСАРАМАЦІЦЬ

Па словах Леаніда Скарабагатага, пік адбіранняў дзяцей прыйшоўся на 2012—2013 гады, у 2016 годзе гэты паказчык зменшыўся на 1200 дзяцей, у 2017 годзе пакуль што зафіксаваны адзіночныя выпадкі. Існуе тлумачэнне Міністэрства адукацыі, якое забараняе праводзіць нечаканыя праверкі. Такім чынам, бацькі атрымалі магчымасць дамаўляцца на зручны час, і прыход камісіі перастаў быць шокам. Але, са слоў **шматдзетнай маці Наталлі ЯНУШКЕВІЧ,** непрыемныя выпадкі здараюцца:

— У праверках камісій шмат суб'ектывізму. Дэкрэт №18 ствараўся, каб дапамагаць шматдзетным бацькам і сем'ям з прыёмнымі дзецьмі, але чамусьці некаторыя правяраючыя ператвараюць гэты працэс у пошук абвінавачванняў. У жылым доме, тым больш з дзецьмі, не бывае ідэальнага быту. І калі пасля агляду з пазіцыі «вы нам павінны» члены камісіі сарамацяць маці за пыл на люстры або раскіданыя рэчы, прычым робяць гэта на вачах у дзяцей, то ўявіце, які гэта ўдар па бацькоўскім аўтарытэце і негатыўны вопыт самога маленькага чалавека! У дзіцяці замацоўваецца разуменне, што ў любы момант чужыя дзядзі і цёці могуць зазірнуць да яго ў пакой і насварыцца за цацкі на падлозе.

Наогул, агляд дома, дзе жыве сям'я, чужымі людзьмі — далікатнае пытанне. Камісія зазірае ў пакоі, шафы, халадзільнік, пералічвае адзенне і рэчы... Часам гэта адбываецца на вачах дзяцей, у тым ліку падлеткаў, якія наогул хваравіта адносяцца да заходаў на «іх тэрыторыю».

Ці ёсць варыянт больш ашчаднага для дзіцячай псіхікі метаду кантролю? Алена Кашына лічыць, што так. Той жа настаўнік рэгулярна бачыць школьніка на занятках. Калі дзіця выглядае стомленым, замкнутым, калі ў яго неахайнае адзенне і недагледжаны знешні выгляд, нізкая сацыялізацыя ці пастаянныя канфлікты з аднакласнікамі — гэта трывожныя званочкі небяспечнага становішча.

ЦІ СТАНЕ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ ВЫЙСЦЕМ?

Да пытання па абароне дзяцей ад неспрыяльных умоў нельга падыходзіць адназначна, лічыць **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Алена АНІСІМ.**

Не толькі дзіця са шматдзетнай сям'і можа трапіць у небяспечнае становішча. Галоўная бяда — у адносінах бацькоў да сваіх абавязкаў. Для прыкладу, дзве сітуацыі. З аднаго боку, сям'я, дзе тата і мама заняты на працы з нізкай аплатай і таму церпяць нястачу. З другога — асацыяльны лад жыцця старэйшых родзічаў, якія нават не ўспомняць, ці кармілі яны сёння дзіця. Пры знешне агульным параметры малазабяспечанасці паміж гэтымі двума выпадкамі вялікая розніца. Было б слушна ў выяўленні праблемных сем'яў рабіць акцэнт на прафілактыку і падтрымку. Асабліва гэта актуальна для вёскі, дзе суседзі ведаюць, што маці часта ўжывае алкаголь, але адначасова любіць сваё дзіця. У вачах аднавяскоўцаў гэты факт быццам бы «выбачае» слабасць маці. Але такая любоў можа прывесці да бяды, бо жанчына не ў стане кіраваць нават уласным жыццём, спускаючы сродкі на спіртное.

— Апошнім часам з Міністэрства адукацыі была агучана інфармацыя пра падрыхтоўку змен у адно з палажэнняў. Магчыма, яны дазволяць згладзіць спрэчныя моманты з пастановай сем'яў на ўлік, — кажа Алена Анісім. — Аднак, на мой погляд, важна стварыць у грамадстве інфармацыйны трэнд, які б рабіў упор на імкненне да лепшага жыцця. Чалавеку дадзена шмат магчымасцяў, хай толькі вырашыць, чаго ён хоча, што ўмее і на што прэтэндуе. Сёння дзяржава зацікаўлена ў працаўладкаванні людзей. Калі яшчэ звярнуць увагу на тэхналагічнасць некаторых работ і дастатковую аплату, то некаторыя праблемныя пытанні знікнуць самі сабой: людзям стане нецікава, нявыгадна сядзець на месцы, для іх адкрыецца перспектыва.

ЗАМЕСТА ПУДЗІЛА — ВЫРАТАВАЛЬНЫ КРУГ

— Мы не гаворым, што законы знарок ускладняюць жыццё сем'ям. Законы, наадварот, прызначаныя, каб выявіць праблему як мага раней і дапамагчы не трапіць у складанае становішча, — кажа Алена Кашына. Але пры гэтым дапаўняе, што сам падыход да правядзення праверак павінен змяніцца.

На думку юрыста, найперш трэба пазбавіцца ад стэрэатыпу, што дзяцей адбіраюць толькі ў амаральных бацькоў, маўляў, самі ў гэтым вінаватыя.

Другая мера, якая б магла палепшыць узаемаадносіны кантрольных службаў і бацькоў, — змены ў заканадаўстве, больш дакладныя фармулёўкі крытэрыяў праверкі. Напрыклад, несправядлівая сітуацыя, калі мама баіцца прасіць матэрыяльную дапамогу для дзіцяці, бо адзін з магчымых крытэрыяў пастаноўкі на ўлік СНС якраз звязаны з яе частымі запытамі. Пры гэтым нідзе не прапісана, што трэба разумець пад словам «частыя». Або яшчэ прыклад — пра сямейную тыранію. Калі хтонебудзь з бацькоў праяўляе гвалт у адносінах да родных, то пакараюць не толькі агрэсара, але і ахвяру, прымусова адабраўшы дзіця ў прытулак.

Было б слушна ў выяўленні праблемных сем'яў рабіць акцэнт на прафілактыку і падтрымку.

Трэцяя змена, якую б хацелі бачыць удзельнікі абмеркавання, — строгае рэгламентаванне дзеянняў унутры кантрольных устаноў. «Устаўшчына» ў гэтым выпадку дазволіць бацькам абараняць свае правы ў выпадку несправядлівых рэзалюцый камісіі альбо парушэнняў з яе боку.

— Калі бацькі недасведчаныя ў юрыдычных тонкасцях, раю ім звяртацца да спецыялістаў, — кажа Алена Кашына. — Кансультацыю цяпер можна атрымаць па тэлефоне ці праз інтэрнэт. У любым выпадку, бацькі павінны ўсведамляць, што яны змагаюцца за сваё дзіця.

Як бачна, пытанне па праблемных сем'ях не мае адназначнага вырашэння. З аднаго боку, патрэбна ўдакладненне законаў, якія рэгулююць нормы дабрабыту малога. З другога — бацькам таксама неабходна падтрымка. У любым выпадку, галоўную ролю адыгрывае індывідуальны падыход да кожнага выпадку і вечны прынцып урачоў: «Не нашкодзь».

Рагнеда ЮРГЕЛЬ.
yurgel@zviazda.by

■ Урокі жыцця

КРЫЎДА

Кожны раз, калі Марыйка рабіла чарговую ўборку ў кватэры, яна заўсёды натыкалася на гэтую рэч... І нейкая крыўда тады ўзнікала. Балючая і непрыемная. Адразу ўспаміналася адна гісторыя, пра якую ніхто не ведаў. Нават родныя... А было гэта так.

Марыйка тады працавала журналістам у адной гарадской газеце. Вядома ж, даводзілася шмат шчыраваць не толькі за рабочым сталом, але і дома. Камп'ютараў тады ў продажы не было. А калі дзесьці і з'яўляліся — кошт быў недасягальным...

Вось і марыла дзяўчына купіць сабе пішучую машынку, таму рэгулярна глядзела розныя аб'явесткі. Неяк у газеце ўбачыла тое, што так даўно шукала. Узрадавалася! І цана не надта высокая. Дый і першы заробак учора атрымала.

Хуценька патэлефанавала па патрэбным нумары. Відаць, у гарадской кватэры цярпліва чакалі гэты званок. Адразу пачула жаночы голас. Павіталася. Высветлілася, што пішучая машынка «Рамонак». І працуе добра. Вера, так назвала сябе жанчына, старанна прадыктавала хатні адрас. Маўляў, заўтра вас чакаем! Абавязкова прыязджайце.

Назаўтра адразу пасля работы Марыйка завітала да прадавачкі. Сустрэлі яе ветліва. І прадэманстравалі машынку.

— Працуе толькі ад электрычнасці! — з нейкім пафасным гонарам папярэдзіла Вера. — І не трэба біць пальцамі, вылупіўшы вочы, па клавіятуры, мазалі наганяць. Вось так, лёгка націснулі на патрэбную клавішу, і з'яўляюцца на паперы літаркі. Упэўнена: будзеце вельмі задаволеная.

Зірнуўшы ў бок мажнога мужчыны, які сядзеў у прасторнай вітальні каля музычнага цэнтра, прадавачка прашаптала:

— Ведаеце, мой муж нечакана страціў зрок. Цукровы дыябет у яго. Нічога ўжо не бачыць. Зусім. А грошы патрэбныя на лекі. Вось таму вырашылі машынку прадаць. А мне гэтая рэч непатрэбная, бо працую прыбіральшчыцай на заводзе.

Марыйка, пільна зірнуўшы на чорную стужку, пацікавілася:

— Бачу, што ўжо амаль адслужыла сваё. Ці будзе друкаваць? У запасе ёсць такая ж, ці не?

— Няма, — адказала Вера. — Але ж вы, калі ласка, не хвалюйцеся. У краме можна набыць. Там, дзе прадаюцца алоўкі, сшыткі... А пакуль — добра намачыце чорным чарнілам. І ўсё будзе цудоўна.

Пра тое, што яе абвялі вакол пальца, Марыйка даведалася толькі дома. Доўгачаканая і жаданая пішучая машынка не пажадала друкаваць тэксты. Таму зноўку давялося рыхтаваць матэрыялы «ад рукі». Але супакоіла сябе тым, што заўтра зазірне ў краму, купіць гэтую неабходную стужку.

Але ж, як высветлілася, у крамах даўно не прадаюць такія рэчы. Спагадлівыя прадавачкі

параілі звярнуцца па дапамогу да майстра, які займаецца рамонтам такой тэхнікі. Давялося зноўку глядзець аб'явы... Знайшла, патэлефанавала. Мужчына толькі паспачуваў...

...Літаральна праз месяц Марыйка нечакана сустрэла гаспадароў гэтай пішучай машынкі ў адной краме. Пачуўшы вясёлы і гучны смех, азірнулася. І ўбачыла, што Вера і яе «сляпы» муж нешта ўважліва разглядалі за шкляным прылаўкам. Абураная, зрабіўшы адзін крок да гэтых ліхадзеяў, на момант прыпынілася. Вырашыла, што не будзе ўздымаць лямант. Сумна ўсміхнулася і ціхенька прашаптала пра сябе: «Бумеранг вернецца. Абавязкова!»

Ганна АТРОШЧАНКА, *г. Гомель.*

ЗУБ ДАЮ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— А вы каму даўраеце свае зубы?

— Свайму былому студэнту, зараз ён мой калега. За апошнія пяць гадоў я пяць разоў быў на прафілактычным аглядзе. І толькі аднойчы штосьці невялічкае давялося рабіць з зубам. Мы ж, стаматолагі, ведаем, што вельмі складана выправіць тое, што запушчана. Лепш лячыць карыес на пачатковай стадыі. Гэта і для стаматолага прасцей, і пацыента не так б'е па кішэні. Бо невялічкі карыес вылечыць значна танней, чым пульпіт, а потым яшчэ паставіць на гэты зуб каронку.

— Але ж большасць людзей цягне да апошняга: запісваецца на прыём толькі калі трываць боль ужо немагчыма...

— З кожным годам я бачу ўсё менш і менш запушчаных выпадкаў. Людзі, нарэшце, пачынаюць сябе любіць. Звычайна мужоў прыводзяць жонкі, рэдка калі жонак прыводзяць мужчыны. Жанчыны больш клапоцяцца пра сваё здароўе.

— Што рабіць, калі забалеў зуб, а магчымасці тэрмінова звярнуцца да стаматолага няма?

— Галоўнае, не нашкодзіць сабе. Не трэба грэць месца, якое баліць, звонку. Не прыкладвайце да шчакі цёплы ці гарачы кампрэсы, грэлку. Нельга спаць на гэтай шчацэ, бо рызыкуеце нарасціць за ноч трэць твару. Грэцца трэба знутры. Але не моцнымі напоямі, як шмат хто любіць, а адварам зёлак — падыдзе рамонак, шалфей, каляндула, нават звычайны чай. Бераце кубачак у адну руку, тазік — у другую, уключаеце любімы фільм, і на працягу гадзінкі-дзвюх грэецеся: набіраеце гарбатку за шчаку, трымаеце, пакуль не астыне, і выплёўваеце. Чым часцей, тым лепш. Гэта здымае боль і крыху запаленне.

«Нікому не раю адбельваючыя зубныя пасты»

— Ад чаго залежыць здароўе зубоў — ад ежы, генетыкі, гігіены?

— Ад першага, другога і трэцяга. Але асноўныя прычыны стаматалагічных хвароб — гэта карыесагенныя мікробы. Таму вельмі важна рэгулярна выконваць гігіену поласці рота. І нават калі ў вашых бацькоў дрэнныя зубы, ці вы не ўяўляеце свайго жыцця без палачкі «Твікс», вы можаце захаваць «здаровую ўсмешку» на ўсё жыццё. Зразумела, есць выпадкі, калі без прафілактычнай дапамогі стаматолага не абысціся (спытайце свайго доктара, што такое «закрытая фісура»). Але ўсё (дакладней усе яны, зубы) у вашых руках.

Цудоўная альтэрнатыва жуйцы — звычайныя яблык ці морква.

Некаторыя пацыенты абураюцца: «Я чышчу зубы па 10 хвілін тры разы на дзень. Чаму ў мяне з'яўляецца карыес?» Многія памылкова думаюць, што чым больш па часе яны чысцяць зубы, тым лепш. Але ж галоўнае — тэхніка чысткі. Раю схадзіць да свайго стаматолага, ён з вялікай радасцю замест таго, каб свідраваць зубы, пакажа, як іх правільна чысціць. Ёсць яшчэ адмысловая вадкасць (і нават таблеткі) для афарбоўвання зубнога налёту. Дастаткова прапаласкаць ёй рот — і вы ўбачыце тыя вобласці, якія не дачысцілі. Такім чынам, пасля таго, як усміхнуліся сабе ў люстэрка, можна ўзяць шчотку ці зубную нітку і скарэктаваць тэхніку чысткі.



Фота Надзеі ДРЫЛЫ.

— Колькі часу ў суткі трэба прысвяціць сваім зубам?

— Раніцай тры хвіліны, вечарам столькі ж. Многія дапускаюць памылку: ледзь прачнуліся, адразу бягуць чысціць зубы. Пасля шчаслівыя размазваюць па іх свой ранішні бутэрброд. І, думаючы, што ў іх чыстыя зубы, ідуць на работу. А зубы былі чыстыя роўна 15 хвілін, пакуль яны гатавалі свой бутэрброд.

— Чаму так важна карыстацца зубной ніткай?

— Кантактныя паверхні паміж зубоў эфектыўна чысцяцца толькі з дапамогай зубных нітак. Я раю сваім пацыентам тыя, якія пад уздзеяннем сліны становяцца больш аб'ёмнымі, тым самым запаўняюць міжзубны прамежак і больш чагосьці могуць з яго дастаць. Некаторыя так актыўна арудуюць зубной ніткай, што раняць дзясны. Папрасіце свайго стаматолага паказаць, як правільна ёй карыстацца, каб не выклікаць больш дрэнных наступстваў.

— Большасць вытворцаў сучасных зубных пастаў абяцаюць пакупнікам беласнежную ўсмешку. Ці эфектыўнае такое адбельванне?

— Адбельваючыя пасты ў параўнанні са звычайнымі ўтрымліваюць большую колькасць абразіваў. І пры няправільнай тэхніцы чысткі вельмі лёгка нашкодзіць сабе (зарабіць клінавідныя дэфекты, якія часта праяўляюцца большай адчувальнасцю зубоў). Таму я нікому не раю адбельваючыя пасты. Наогул яны першапачаткова ствараліся, каб падтрымаць эфект адбельвання, якога дасягнулі ў кабінеце стаматолага.

— Вы б самі сабе адбельвалі зубы?

— Я для сябе не адчуваю такой неабходнасці. Звычайна зубы пачынаюць выглядаць больш прывабна пасля той жа працэдуры прафгігіены поласці рота, загару, або выкарыстання больш цёмнай памады ў дзяўчат. Таму, перш чым ісці на адбельванне, раю паспрабаваць штосьці з гэтага.

Да працэдуры адбельвання я стаўлюся вельмі асцярожна, бо тут, як у любой справе, існуюць свае паказанні і супрацьпаказанні. Нельга рабіць усё, што кажа пацыент. Напрыклад, ён можа мець штучныя пратэзы ці пломбы на пярэдніх зубах, і калі ты пачынаеш адбельваць, адбельваюцца толькі свае зубы...

— Як выбраць зубную пасту?

— У пасце для дарослых абавязкова павінен быць фтор, сярэдняя колькасць — 1450 ppm. У астатнім кіруйцеся сваімі адчуваннямі. Калі я праз пяць гадзін адчуваю, што мае зубы чыстыя, гладкія — гэта добрая паста. Ёсць жа такія пасты, што ўжо праз гадзіну разумееш — не ўсё так добра, як магло б быць.

— А зубную шчотку?

— Шчоткі бываюць звычайныя мануальныя і электрычныя. Апошнія распрацоўваліся для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Я гадоў пяць таму меў электрычную шчотку, але адчуў, што звычайнай можна пачысціць не горш. Шчоткі адрозніваюцца па жорсткасці. Тым, у каго адчувальныя зубы ды краваточаць дзясны, пажадана мець мяккія. Людзям, якія кураць, п'юць моцную каву і чай раю больш жорсткія, яны найлепш прыбіраюць пігментаваны налёт. Не забывайцеся мяняць зубную шчотку кожныя тры месяцы. Бо яна, як і рызіна ў аўтамабілі, зношваецца. Дарэчы, не варта забывацца, што гігіена поласці рота ўключае ў сябе таксама чыстку языка...

— А як выбраць апалосквальнік для поласці рота?

— Галоўнае, каб ён не ўтрымліваў спірту.

— У рэкламе часам сцвярджаюць, што жуйка папярэджвае ўзнікненне карыесу?

— Гэта рэкламны ход. Жуйка ачышчае толькі адну з пяці паверхняў зубоў — жавальную. Больш за тое, яе можна жаваць не больш за дзесяць хвілін і толькі пасля прыёму ежы. У іншым выпадку рызыкуеце зарабіць гастрыт. Цудоўная альтэрнатыва жуйцы — звычайныя яблык ці морква. Яны не толькі ачысцяць жавальную паверхню зубоў ды прастымулююць выпрацоўку страўнікавага соку, але і падараць вашаму арганізму карысныя вітаміны.

«Першы паход да стаматолага — справа сур'ёзная»

— Ці праўда, што калі ў аднаго з бацькоў дрэнныя зубы, тады і дзеці будуць пастаяннымі кліентамі стаматолага?

— Не абавязкова. Дзіця нараджаецца са стэрыльнай поласцю рота. Потым з цягам часу «гадуе» сваю мікрафлору. І шмат залежыць ад таго, якія мікробы будуць дамінаваць... Аднойчы назіраў такую сітуацыю: маці гуляе па парку са сваім дзіцем. Малеча трымае ў роце соску. Соска падае, жанчына абцерла яе і паклала спачатку сабе ў рот, а потым — дзіцяці. Тым самым падарыла малечы свае мікробы...

— Я не бачыла яшчэ ніводнае дзіця, якое любіла б чысціць зубы...

— Усё залежыць ад бацькоў. У мяне калега-стаматолаг змалку даглядае за поласцю рота разам з сынам. Ён расказваў, што ў малога істэрыка пачынаецца, калі перад сном не пачысціць зубы.

Вельмі важна закладваць пазітыў у адносінах да сваіх зубоў. Гэта датычыцца і першых паходаў з дзіцем да стаматолагаў. Нельга настройваць малечу і казаць нешта накшталт: «Цябе толькі паглядзяць, не бойся, не будзе балюча». Лепш за ўсё першы раз зладзіць азнаямляльны паход, калі дзіця пакатаюць на крэсле, пакажуць мульцік пра злыя мікробы, падараць зубную шчотку. Другі раз яно з радасцю пойдзе да стаматолага.

— Што можаце параіць людзям, якія з дзяцінства баяцца зубнога доктара?

— Каб пераадолець страх, трэба пазітыўны досвед. Шукайце таго спецыяліста, з якім будзе перш за ўсё ўтульна эмацыянальна. Я сам у дзяцінстве баяўся стаматолага. Ніколі не забудуся на крыкі, якія даносіліся з яго кабінета. Так не павінна быць. Цудоўна, калі мамы расказваюць сваім дзецям пра зубных фей, якія кладуць пад падушку падарункі. Я, дарэчы, нядаўна разбіраў рэчы, і знайшоў свае малочныя зубы. Мама захавала. Цяпер прадаюцца нават адмысловыя драўляныя скрыначкі для малочных зубоў. Я набываў такія ў падарунак сваім сябрам, у якіх маленькія дзеці.

Лепш лячыць карыес на пачатковай стадыі. Гэта і для стаматолага прасцей, і пацыента не так б'е па кішэні.

— Ці важна захоўваць зубы мудрасці?

— Усё залежыць ад таго, у якім яны стане. Існуюць паказанні для выдалення. Я, як артапед, часта выкарыстоўваю зубы мудрасці для апоры розных канструкцый. Калі б іх не было, чалавек выйшаў бы на варыянт здымнага пратэза. А так можна зрабіць мостападобны пратэз і аднавіць цэласнасць зубнога раду. Я ніколі не спяшаюся нічога выдаляць, змагаюся за кожны зуб. Свая натуральная апора з пункту гледжання далейшага функцыянавання ўсё ж такі лепшая за штучную.

— Што вы можаце параіць сваім цяперашнім і будучым пацыентам?

— Заўсёды імкнуся зрабіць сваю работу якасна. Але ёсць выпадкі, калі праз паўгода пацыент завітвае да мяне зноў. Гляджу, той зуб, які я лячыў, стаіць, але ён увесь у налёце і суседнія зубы, якія паўгода таму былі здаровыя, ужо з карыесам у стадыі плямы. Ведаеш, чым адрозніваецца праца стаматолага ад працы, напрыклад, рамесніка? Апошні вырабіў нейкую цікавую статуэтку. Чалавек набыў, паставіў на паліцу, і яна радуе яго шмат гадоў у адным і тым жа выглядзе. Зубы ж кожны дзень працуюць. Таму калі вы хочаце, каб яны былі здаровыя, тады павінны штодзень клапаціцца пра іх: старанна чысціць, карэктаваць сваю чыстку. Супрацоўнічайце са сваім стаматолагам, бо ў адваротным выпадку нічога талковага, нават за вялікія грошы, не атрымаецца.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
nadzieja@zviazda.by

Мінск—Віцебск.

Пастарнак — корань даўгалецця!

Сярод гародніны, якую мы вырошчваем на сваім лецішчы, пачэснае месца займае пастарнак! А ўсё таму, што яго корань валодае шырокім дыяпазонам гаючых якасцяў.

У прыватнасці, ён паляпшае страваванне, умацоўвае сценкі сасудаў, прымяняецца пры нервовых захворваннях, неўрозах, а таксама стымулюе работу нашага мозга.

У ежу мы з жонкай выкарыстоўваем караняплоды (у якасці гарніру да другіх страў) і маладое лісце пастарнаку (у якасці прыправы да супоў, а таксама да многіх салатаў). Незаменны ён і пры саленні ды марынаванні гародніны.

Гэтая расліна марозаўстойлівая, любіць святло, патрабавальная да добрай вільготнасці глебы. Высейваем мы яе пад зіму, як і моркву, дзесьці ў канцы кастрычніка або пачатку лістапада! Глыбіня пасеву — 2—2,5 см на нашай суглінкавай і ўрадлівай глебе (на лёгкіх пясчаных або тарфяных глебах — да 3,5 см). Градку для пастарнаку трэба выбіраць крыху вышэй, каб не было доступу да залягання грунтавых водаў.

Яўген САЛАНОВІЧ, дачнік са шматгадовым вопытам.

«АПОШНІ РАЗ СВАРЫЛІСЯ ЯШЧЭ ДА ВЯСЕЛЛЯ»

Надзя завяршае маляваць ілюстрацыі да кнігі пра дзяўчынку і кракадзіла.

Пра Ганну Сілівончык, лятаючую елку ды аплатку

— А самі, калі сварыцеся з мужам, успамінаеце пра Пігласа?

Надзя: Піглас — абярэг нашай сям'і. Я нават не памятаю, калі мы апошні раз сварыліся... Напэўна, яшчэ да вяселля. А жанатыя мы ўжо 14 гадоў.

— Як думаеце, чым ваша сям'я адрозніваецца ад іншых?

Надзя: У нас, напэўна, карцін у кватэры больш, чым у іншых сем'яў, бо я мастачка. Мне падабаецца жыць у акружэнні сваіх работ. Праўда, нам яшчэ далёка да Ані Сілівончык і Васіля Пешкуна.

Гена: Мы сябруем сем'ямі.

Надзя: У іх кватэры карціны вісяць не толькі на сценах, там нават дзверы і шафы размаляваныя. Мы тут жывём не так даўно, яшчэ ўсё наперадзе. У мяне ў найбліжэйшых планах размаляваць сцяну ў спальні.

Інтэр'ер у нас, як вы заўважылі, у скандынаўскім стылі. Белыя сцены ды падлога, ніякай лішняй мэблі. Дарэчы, на пачатку гэтага месяца, на мой дзень нараджэння, Гена завёз мяне на радзіму далёкіх продкаў — у Швецыю. Там я на свае вочы пераканалася, што шведы цэняць выяўленчае мастацтва, у іх кватэрах вельмі шмат графікі, жывапісу. Менавіта адсюль такая любоў да белых сцен...

— Неўзабаве Новы год. Як вы да яго рыхтуецеся? Можа, замест сняжынак выразаеце з паперы ажурныя буцінанкі (аўтарская тэхніка Надзі Букі, якая адрозніваецца ад традыцыйнай выцінанкі адсутнасцю сіметрыі ды сюррэалістычным сюжэтам. — Аўт.)?

а раней — у ноч перад Калядамі. Звычайна збіраемся сям'ёй за святочным сталом вігілійным вечарам, дзелімся аплаткай.

— За што хацелі б сказаць дзякуй адно аднаму?

Гена: У мяне ажно трое дзяцей: жонка і двое сыноў *(смяецца)*. Я ўдзячны ім за тое, што яны ёсць у маім жыцці. Робяць яго больш шчаслівым і вясёлым. Надаюць сэнс кожнаму дню. Мужчыну абавязкова трэба пра некага клапаціцца.

Надзя: А я ўдзячная Гену за яго дабрыню. Не ведаю больш добрых людзей, чым муж. Яго можна параўнаць хіба што з Дзедам Марозам *(смяецца)*. Дзецям жа ўдзячная за натхненне, яны мае Пігласы. Жэня з Янам з'яўляюцца прататыпамі герояў маіх карцін, казак.

Пра сняданкі ад мужа, металюгу ды залаты ланцужок

— Калі я правільна заўважыла, вы з мужам вельмі розныя, але пры гэтым цудоўна дапаўняеце адно аднаго...

Надзя: Так, мы абсалютна розныя па характары. Гена сур'ёзны, а я вясёлая. Ён моцна стаіць нагамі на зямлі, а я пастаянна дзесьці «лётаю», гэта характэрна для творчых людзей. Неяк намалявала аўтапартрэт нашай пары. Карціна называецца «Без межаў». Я на звязцы з Пігласаў падымаюся ўверх, а Гена трымае мяне за руку, не дае цалкам зляцець. Гэта добра, бо своечасова спыніцца вельмі важна. Фінансы ў нашай сям'і вядзе Гена, ён жа па адукацыі эканаміст... У мяне лепш атрымліваецца траціць грошы.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Надзя: Памятаеш, Гена, у нас на вокнах была лятаючая елка, вялікая такая, з крыламі. Нават рэпартаж пра яе рабілі. Сёлета не паспею, напэўна, зрабіць штосьці маштабнае. Для мяне важней у перыяд Адвенту прэзентаваць сваю кнігу пра Басю і Пігласа хворым дзеткам, паўдзельнічаць у дабрачынных сустрэчах.

Гена: На днях мы будзем усе разам упрыгожваць ёлку. Падарункі пад ёй дзеці знаходзяць не на Новы год, гадзін дзвюх ночы малюю. Таму ранкам мяне можа разбудзіць толькі пах свежазаваранай кавы.

Гена: А я ўстаю рана. Жэньку ў школу трэба адправіць, Надзю разбудзіць, каб яна адвяла Яна ў садзік *(смяецца)*.

— Цікава, дзе пазнаёміліся мастачка і эканаміст?

Надзя: *(спявае)* Музыка на-а-а-с звязала... Мы з Генам бачыліся на рок-канцэртах у Маладзечне, абое адтуль родам. Я скакала і трэсла галавой, як сапраўдны металюга. Тады ў мяне былі доўгія валасы...

Гена: З ног да галавы была ланцугамі абвешаная.

Гена: Куды Жэня толькі не хадзіў: і ў футбольны клуб, і гандболам займаўся ў школе Алімпійскага рэзерву. А ў адзін цудоўны дзень прыйшоў дадому з трэніроўкі і сказаў, што не хоча больш займацца спортам. Іншыя б абурыліся: «Ты што, столькі ж сіл і часу ўклалі». Мы таксама вазілі сына на трэніроўкі, плацілі немалыя грошы. Тым не менш даволі спакойна да гэтага паставіліся.

Надзя: Не настойвалі, бо самі былі дзецьмі. Ведаем, што перш, чым знайсці сябе, трэба пераспрабаваць вельмі шмат. Жэня марыць у будучыні стаць трэнерам па хіп-хопе. Калі яго жаданне не зменіцца, я не буду перашкаджаць. Бацькам трэба падтрымліваць дзіця, дапамагаць знайсці сваё прызванне. Бо чалавек шчаслівы толькі тады, калі адчувае сябе на сваім месцы.

«Я вельмі рада, што ў дзяцей вялікая розніца ва ўзросце. Жэня можа прыгледзець за Янам, пачытаць яму ўслых».

(У гэты час Жэня якраз трэніруецца ў сваім пакоі ў навушніках, праз 20 хвілін ён павінен быць на занятку па хіп-хопу).

— Дык вось чаму Жэня перад трэніроўкай надзеў ланцужок на шыю...

Надзя: Толькі ў яго залаты па хіп-хопе. Мы, дарэчы, тады не паважалі гэты кірунак музыкі.

Гена: Мне і зараз не падабаецца гэта музыка. Але я не забараняю сыну яе слухаць. Больш за тое, каб быць бліжэй да Жэні, сам пачаў цікавіцца хіп-хопам. Прачытаю што-небудзь пра выканаўцаў і пачынаю яму расказваць.

Надзя: Мы з Генам імкнёмся быць сябрамі для сваіх дзяцей.

— Хто захацеў, каб Жэня хадзіў на танцы?

Надзя: Сам папрасіўся. Нядаўна яны з Генам вярнуліся з чэмпіянату свету, які праходзіў у Чэхіі. Жэня класна танцуе, выступаў у намінацыі «сола», увайшоў у 1/8 фіналу. Гэта добры вынік, бо ён займаецца хіп-хопам менш як год.

— Некаторыя бацькі яшчэ да нараджэння дзіцяці плануюць яго будучыню...

Надзя: Гэта адназначна не наш варыянт. Мы не дыктуем сыну, на якія гурткі яму хадзіць. Я магу накіраваць, падказаць. Але катэгарычна супраць таго, каб прымушаць.

Пра мыльныя бурбалкі, Уладзіміра Познера ды ліміт на Сплендэрмена

— Надзя, тое, што вы верыце ў Пігласа, не выклікае сумненняў. А вось ці вераць у яго вашы дзеці?

Надзя: Канешне. Ян расказваў у дзіцячым садку, што Піглас размаўляе мыльнымі бурбалкамі і харчуецца драўлянымі прышчэпкамі. Старэйшы сын наогул быў маім першым рэдактарам, менавіта яму я чытала чарнавікі кнігі. Часам ён рабіў слушныя заўвагі. Дарэчы, працяг казачнай гісторыі я ўжо напісала. Новая кніга будзе называцца «Бася і яе чароўны свет». Там, акрамя Пігласа, будзе шмат незвычайных герояў, якія таксама ўжо даўно жывуць на маіх карцінах. Засталося толькі намаляваць ілюстрацыі. Дарэчы, літаральна перад вашым прыходам я дамалявала вокладку для дзіцячай кнігі пра дзяўчынку і кракадзіла Паўла Гушынца *(паказвае)*. Яна, дарэчы, выйдзе ў Выдавецкім доме «Звязда».

— Казку пра Пігласа напісалі па-беларуску. Якое месца беларускасць займае ў выхаванні вашых дзетак?

Надзя: Дома мы размаўляем па-руску. Але калі чытаем кнігі на беларускай мове, абмяркоўваем іх па-беларуску. У старэйшага сына больш гадзін роднай мовы, чым у яго аднакласнікаў, бо ён ходзіць у маю мастацкую студыю. Па вечарах я бясплатна выкладаю пры касцёле, там усё па-беларуску.

Гена: У касцёле мы заўсёды размаўляем па-беларуску. Кожную нядзелю ўсёй сям'ёй едзем туды на ранішнюю службу.

Надзя: У выдавецтве мяне папярэдзілі, што кнігу на рускай мове будуць набываць лепш. Але для мяне было прынцыпова, каб яна выйшла на роднай мове. Хочацца, каб дзеці больш чыталі па-беларуску.

— Надзя падчас аднаго з інтэрв'ю сказала: «Лепш няхай дзеці вераць у Пігласа, чым у Сплендэрмена з камп'ютарнай гульні. Мяне гэтыя сучасныя камп'ютарныя героі не радуюць, у іх заўсёды прысутнічае элемент жорсткасці». Адной з бед сучаснасці з'яўляюцца камп'ютарныя гульні. Вашу сям'ю яна закранула?

Гена: Жэня — не анёл, таксама гуляе ў камп'ютарныя гульні. Але ў нас ёсць ліміт. Гадзіна ў дзень. Але калі падчас гульні сыну патэлефануе сябар, ён з радасцю пойдзе з ім на вуліцу.

Надзя: Калі ж дзеці сапраўды зацыкленыя на камп'ютары, то гэта праблема не столькі іх, колькі іх бацькоў. Значыць, бацькам зручна, каб іх дзіця сядзела перад маніторам і не замінала. Тое ж самае і з мульцікамі. Трэба паказваць дзецям, што ў свеце існуе шмат усяго цікавага.

Гена: «Ян, не будзь букам, пакажы, як ты ўмееш маляваць».

Надзя: Мы так часта жартуем адно з аднаго.

.— Заўважыла, што Гена — клапатлівы тата. Пакуль мы размаўляем, ён паспеў і з Янам пагуляць, і супам яго накарміць...

Надзя: Так, я хацела б сабе такога тату, як Гена. Ён вельмі шмат часу бавіць з дзецьмі.

— Як часта вы гаворыце адно аднаму «я цябе люблю»?

Надзя: Па некалькі разоў на дзень. «Я цябе люблю» *(Надзя прытуліла да сябе Янчыка, які якраз у гэты момант падбег да мамы)*.

Дарэчы, я часта пытаюся ў сваіх 30-гадовых сябровак: «Як часта ты кажаш сваёй маме, што ты яе любіш?». — «Ды я ніколі не казала ёй гэтага», — чую звычайна ў адказ. Нашы бацькі выраслі ў такі час, калі не прынята было праяўляць свае пачуцці на словах. Але і іх можна перавыхаваць *(усміхаецца)*. Паспрабуйце штодзень казаць сваім бацькам, што вы іх любіце — і ўбачыце, як здарыцца цуд. Яны спачатку будуць усміхацца, а потым і самі пачнуць казаць вам цёплыя словы ў адказ. Вельмі важна як мага часцей агучваць свае пачуцці, каб потым не шкадаваць, што не паспелі сказаць чалавеку, што яго любім. Бо ніхто ж не ведае, колькі кожнаму з нас адмерана.

— Калі б былі на маім месцы, якое апошняе пытанне задалі б сабе?

Надзя: Я вельмі часта задаю сабе кароннае пытанне аднаго з маіх любімых інтэрв'юераў Уладзіміра Познера. «Што скажаце Богу, калі сустрэнецеся з Ім?»

— І што вы яму скажаце?

Надзя: Я папрасіла б яго праз некалькі гадоў хоць на дзень спусціцца нябачнай на зямлю і паглядзець, што робяць мае сваякі, як яны жывуць.

Гена: Ці будуць твае карціны прадавацца на аўкцыёнах за мільён долараў?

Надзя: Ну так, яшчэ я спытала б, ці стану я папулярным мастаком пасля смерці? Бо, на жаль, звычайна так і адбываецца: толькі пасля смерці мастакі атрымліваюць прызнанне.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
nadzieja@zviazda.by

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

З БОГАМ САМ-НАСАМ

Ад запланаванага да неспадзяванага — толькі крок

Гісторыя пра тое, як можна выправіцца ў нейкае дакладнае месца, а з'явіцца ў выніку ў зусім іншым, вядомая чытачу здаўна і без гэтага тэксту. А ўсё ж паміж яго аўтарам і Калумбам розніца ёсць: калі спадар Хрыстафор «прамазаў» на паўпланеты, то пагрэшнасць апісанага тут падарожжа вымяраецца толькі крокамі.

Звычайна бывае як? Збіраючыся ў вандроўку, вывучаеш наваколле выбранага аб'екта ў радыусе бяскрыўднай даступнасці — каб не было пасля прыкра ўсведамляць, што з-за нечага аднаго прапушчана нешта іншае, не менш, а мо і больш вартае, што было літаральна «пад носам».

Вёску Лаўрышава (у якую мы выбраліся, каб стаць сведкамі самых сапраўдных археалагічных раскопак) ад вёскі Шчорсы з палацам Храптовічаў (у які мы з-за гэтых раскопак не трапілі) аддзяляе сем кіламетраў. Але няхай Храптовічы выбачаюць, бо блукаць па іх закінутай бібліятэцы, у якой некалі можна было пагартаць і хронікі Стрыйкоўскага, і біблію Астрожскую, і творы Каханоўскага ды Гурніцкага, і розныя брашуры часу чатырохгадовага сойма, — хадзіць па гэтым будынку з пустымі вачніцамі — не вельмі цікавы занятак. І гэта не дзіва, бо яшчэ Аляксандр Ельскі, гісторык, этнограф, краязнавец, пісьменнік, перакладчык і публіцыст, знайшоў тыя кніжкі «у вялікім хаосе»: з-за працякання столі яны былі «знесены ў бяспечнае ад вільгаці месца і складзены ў стосы». Так паведамляе нам Раман Афтаназы пра справы 1880 года. Гэта, спадарства, пра тое, што не ўсе гістарычныя помнікі знішчыла, як прывыклася думаць, гаротнае XX стагоддзе, што хапала знішчальнікаў і раней, і што не варта асабліва купляцца на прозвішчы тых, каго, маўляў, павінны памятаць легендарныя сцены, калі яны іх па

У гэтай бібліятэцы праседжвалі за каштоўнымі выданнямі Адам Міцкевіч і Іахім Лялевель, Антоні Эдвард Адынец і Ян Чачот. Апошні — у якасці бібліятэкара.

факце ніяк не памятаюць. Хоць памятаць, безумоўна, маглі б: некалі тут, у Шчорсах, у сядзібе Храптовічаў і наваколлі была створана такая ўнікальная сістэма вядзення спраў і кіравання гаспадаркай, што хлопы з іншых фальваркаў беглі сюды як у рай, а ў тутэйшай бібліятэцы праседжвалі Адам Міцкевіч і Іахім Лялевель, Ігнат Даніловіч і Іосіф Ярашэвіч, Антоні Эдвард Адынец і Ян Чачот, прычым апошні — у якасці бібліятэкара, набыўшы гэтае працоўнае месца ў 1846-м па вяртанні з выгнання. Бібліятэкар ён быў сапраўдны: не толькі вельмі талкова ўпарадкаваў кнігі, але і падтрымліваў тут «інтэлектуальную атмасферу».

Але мы прыехалі на раскопкі. Каб, што называецца, капнуць яшчэ глыбей. У суседнім са Шчорсамі Лаўрышаве сонечным ліпеньскім днём вяліся пошукі слядоў старадаўняй капліцы — часткі легендарнай Лаўрышаўскай абіцелі, заснаванай яшчэ ў XIII стагоддзі. У адным манускрыпце (калі можна так сказаць пра дакумент, пісаны ад рукі, але ў эпоху друку) дакладна пазначана, што «за вёскай, Лаўрышавам званай, недалёка ёсць капліца з могілкамі, на якіх пахаваны памерлыя манахі і людзі той жа вёскі», што «капліца тая поглядам ад манастыра мае сваё размяшчэнне на поўнач, непадалёк каля могілак, абсаджаных вербамі», што яна «з дрэва брусаванага, гонтай крытая, двума глаўкамі з крыжамі жалезнымі аздоблена, акон у ёй тры», што «звон адзін у глаўцы, дзверы простыя на завесах з клямкамі для замка навяснога» і што «алтар у ёй сталярскай работы, маляваны на оптыку ў ім абраз укрыжаванага Збавіцеля, з дрэва выразаны», а «ўверсе абраз св. Варвары, на палатне маляваны, за шклом» і «сцены аздоблены папяровымі шпалерамі, падлога і столь з дошак».



У гэтым дакументе пазначана, што за вёскай Лаўрышава ёсць капліца.

Перад вачыма, якія такое чытаюць, паўстае між радкамі капліца — адзін у адзін як апісаная. На самай жа справе яе трэба шукаць у зямлі. І ці знойдзецца?

Было так: валанцёры гісторыка-пошукавага летніка, арганізаванага пры сучасным Лаўрышаўскім манастыры, з благаслаўлення ігумена, айца Яўсевія, і пад кіраўніцтвам археолага Тэльмана Маслюкова з калегамі запланавалі на гэты сезон раскопак (якія тут вядуцца не адзін год) пашукаць на могілках сляды той капліцы, спадзеючыся знайсці ад яе хоць бы камень. Спадзяванне абярнулася знаходкай цэлага падмурка, у якім, цяпер ужо расчышчаным, выразна выяўляюцца ганак, прытвор, асноўная і алтарная часткі, і які мы ў той дзень на свае вочы ўбачылі. Падмурак каменны, без слядоў цэглы, бо яна тады тут не выкарыстоўвалася, а над ім... Над ім пяць стагоддзяў, цэлая вечнасць, эквівалентная... таўшчыні падэшвы красовак. Што ёй да палаца Храптовічаў?.. Гэтыя камяні не помняць Елісея Лаўрышаўскага, памерлага ў 1250-м, бо яны былі сюды пакладзены праз трыста гадоў пасля гэтай даты, але што з таго? Ім я адназначна веру: праз іх можна звярнуцца і да яго. Таму прыкладаю далонь і моўчкі чытаю малітву. А валанцёры працягваюць працаваць на расчыстцы гэтага самага сапраўднага помніка.

Уладзіміру Набокаву належыць думка пра тое, што да Бога прыходзяць не ў складзе экскурсіі з экскурсаводам, а ў якасці адзінокіх вандроўнікаў. Мяркую, што ў такіх месцах нават у складзе экскурсіі можна адчуваць сябе з Богам самнасам. Я люблю такія вандроўкі яшчэ і за тое, што яны пацвярджаюць іншую нечую думку: ніхто не ўсведамляе харство падарожжа, пакуль не трапіць дадому і не пакладзе сваю галаву на старую знаёмую падушку. Эмацыянальнае паслядзеянне ад вандроўкі ў Лаўрышаўскую абіцель трымалася, нарастаючы, а не спадаючы, некалькі шчаслівых плённых дзён. Пры гэтым радасна думалася пра тых, хто сюды яшчэ трапіць. Раней на пытанне: «Што можна тут убачыць з таго часу?» адказ быў пра самы стары (дагэтуль) аб'ект турыстычнай цікавасці — прыгожы драўляны храм XVIII стагоддзя. З гэтага лета адказ ужо відавочна іншы: каменны падмурак XVI стагоддзя.

«Час, бывае, ідзе чалавеку насустрач...» — праплыло, як помню, у вечар таго дня ў маёй галаве, ледзь яна паспела крануцца старой знаёмай падушкі.

Падарожнічала Святлана ВОЦІНАВА.

Між іншым

Не наведаныя намі Шчорсы ўмудрыліся адбіцца ў нашай памяці: недалёка ад дарогі пасярод лугавой зеляніны праглядваўся «казачны гарадок», як я яго пра сябе назвала. Гэтую «цацачную», калі глядзець здалёк, крэпасць з цаглянымі сценамі і круглымі вежамі, напаўразбураную, называюць мураванкай Храптовіча, або гаспадарчым дваром. Тут кіпела работа, вынікі якой уяўляюцца сёння ў выглядзе смакаты — той самай шынкі, якую потым даводзілі да кандыцыі ў вяндлярні, а таксама тварожных і цвёрдых сыроў. Вось пра што можна ў нашым жыцці шкадаваць: пра тое, што ніколі нам не паспытаць тых сыроў, якія адсюль разыходзіліся тады па Еўропе, каб быць нарэзанымі на парцэлянавых дошках.

Палац у Шчорсах, якім ён прадстаўлены на старонцы выдання «Tygodnik Ilustrowany» ў 1878 годзе. Дрэварыт.

Паслядоўнікам

Сённяшняя Лаўрышаўская абіцель — Свята-Елісееўскі мужчынскі манастыр — знаходзіцца ў Лаўрышаве толькі часткова. Прынамсі, там размешчаны манастырскі падворак з канцылярыяй, бібліятэкай, царкоўна-гістарычным музеем, пакоямі для валанцёраў і трапезнай. Асноўная ж частка сучаснага манастыра размешчана ў вёсцы Гнесічы. Там у канцы XX стагоддзя ўзведзена і новая царква святога Елісея Лаўрышаўскага. Святы гэты быў сынам князя, які займаў высокую пасаду пры дварэ Міндоўга. Лаўру ён заснаваў разам з адным манахам, якога сустрэў, калі, прыняўшы хрышчэнне, сышоў з дому ў пустынь. Пасля смерці Елісея мошчы яго тварылі некаторыя цуды, а гэта, як ведаем, падстава для кананізацыі. Елісей стаў святым праз трыста гадоў пасля смерці. Хто б што ні думаў, а я тут выкажуся так: прыклад трэба браць са святых айцоў тым з нас, хто пры жыцці сам сабе апранае вобраз гэткага дзеяча, заслугі якога апрыёры неаспрэчныя і недатыкальныя.

Рамантыкам

Сярод так званых фальваркавых пабудоў сядзібы Храптовічаў асаблівасцю вылучаецца невялікі круглы ў аснове «трохпавярховік» — знізу мураваны неатынкаваны, вышэй пакрыты гонтай, як стажок. Гэта была вяндлярня. Канечне, з яе даўно не даносіцца дух шынкі, іначай мы адназначна завярнулі б у яе бок адразу пасля наведвання месца раскопак.

ДАЛЁКА І БЛІЗКА

Святочны кірмаш у Нюрнбергу прадоўжыцца, як і шмат дзе ў Еўропе, да 24 снежня. Ён праводзіцца ў гонар маленькага Хрыста, таму называецца Крыскіндэлсмаркт. Адкрыў яго 1 снежня нюрнбергскі калядны анёл, ролю якога выконвае звычайна прыгажуня ў залацістай вопратцы. Галоўная справа анёла — раздаваць падарункі паслухмяным дзецям. А для дарослых на гэтым кірмашы гатуецца палаючы пунш «Вогненны зуб». Але галоўнае, што варта набыць у Нюрнбергу, — чалавечкі з сухафруктаў.

Да 7 студзеня доўжыцца кірмаш у Бруселі. Чым там можна паласавацца? Ласосем, запечаным на вуголлях, а з салодкага — вафлямі. І калі б вы ведалі, якія гэта вафлі! Мяккія, пухнатыя фігурныя аладкі — не іначай, — пасыпаныя, аблітыя, глазураваныя самымі рознымі пасыпкамі, паліўкамі і глазурамі. Каб пакаштаваць іх усе, давядзецца ў тым Бруселі затрымацца.

Новы год у Празе — гэта вельмі рамантычна. Тамтэйшы кірмаш працягнецца да 4 студзеня. З каляднай Прагі вязіце ў якасці сувеніраў на доўгую памяць шкляны і парцалянавы посуд.

Калі хочацца пакаштаваць пайду са смальцам, трэба ехаць у Кракаў. Там гэты гіганцкі хлеб будзе чакаць вас да 26 студзеня. Акрамя яго на Галоўным рынку ў старой сталіцы прадаюцца самыя разнастайныя мясныя і малочныя стравы, без якіх Новы год у Польшчы ўвогуле ніякі не Новы год.

Нарвежская традыцыя прымушае гаспадынь выкласці на святочны стол ажно сем гатункаў пячэння. Абавязкова дамашняга. Пеперкаке, кажуць, самае смачнае з іх. Не хочаце пакаштаваць нешта незвычайна-неверагоднае? Безумоўна, усё незвычайнае і неверагоднае прадаецца там цяпер у кожнай цукерні.

Да 15 студзеня — Калядны кірмаш у Мінску. Дакладны адрас — Кастрычніцкая плошча і пляцоўка каля Палаца спорту. Нашы калядныя кірмашы не маюць такой славы, якую маюць іншыя еўрапейскія, але гэта, трэба думаць, пакуль. Радасных вам тут пакупак!

БПС-СБЕРБАНК

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2017 года

Открытое акционерное общество «БПС-Сбербанк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	01.10.2017	01.01.2017
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		149 488	110 314
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		7 176	8 969
4	Средства в Национальном банке	1103		109 160	287 679
5	Средства в банках	1104		211 546	95 135
6	Ценные бумаги	1105		904 718	1 061 666
7	Кредиты клиентам	1106		2 840 151	3 184 782
8	Производные финансовые активы	1107		539	589
9	Инвестиции в зависимые юридические лица			5 472	9 045
10	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица			–	–
11	Долгосрочные финансовые вложения	1108		2 908	2 536
12	Основные средства и нематериальные активы	1109		241 910	232 699
13	Имущество, предназначенное для продажи	1110		11 832	13 234
14	Отложенные налоговые активы	1111		–	–
15	Деловая репутация			–	–
16	Прочие активы	1112		41 757	52 194
17	**ИТОГО активы**	**11**		**4 526 657**	**5 058 842**
18	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
19	Средства Национального банка	1201		349	604
20	Средства банков	1202		1 647 183	1 966 070
21	Средства клиентов	1203		2 181 754	2 482 292
22	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		124 112	121 844
23	Производные финансовые обязательства	1205		18 836	1 610
24	Отложенные налоговые обязательства	1206		–	–
25	Прочие обязательства	1207		26 957	26 015
26	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**3 999 191**	**4 598 435**
27	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
28	Уставный фонд	1211		73 585	73 585
29	Эмиссионный доход	1212		–	–
30	Резервный фонд	1213		25 470	24 904
31	Фонд переоценки статей баланса	1214		33 909	34 711
32	Накопленная прибыль	1215		394 502	327 207
33	Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации			527 466	460 407
34	Доля неконтролирующих акционеров			–	–
35	Всего собственный капитал	121		527 466	460 407
36	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**		**4 526 657**	**5 058 842**

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2017 года

Открытое акционерное общество «БПС-Сбербанк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	01.10.2017	01.10.2016
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		221 463	332 465
2	Процентные расходы	2012		69 749	170 034
3	Чистые процентные доходы	201		151 714	162 431
4	Комиссионные доходы	2021		104 481	119 217
5	Комиссионные расходы	2022		28 358	31 025
6	Чистые комиссионные доходы	202		76 123	88 192
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		1 797	(1041)
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(108)	(343)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		53 807	23 783
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		(29259)	(1703)
11	Чистые отчисления в резервы	207		50 129	127 603
12	Прочие доходы	208		20 822	23 938
13	Операционные расходы	209		134 104	138 140
14	Прочие расходы	210		10 124	11 171
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		80 539	18 343
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		10 686	1 302
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		69 853	17 041
18	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц			602	893
19	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц			–	–
20	ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)			70 455	17 934
21	Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку			70 455	17 934
22	Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке)			–	–
23	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях				
24	Базовая прибыль на простую акцию			–	–
25	Разводненная прибыль на простую акцию			–	–

Заместитель Председателя Правления А.В. Борисевич

Главный бухгалтер-директор департамента Н.Н. Ильюкевич

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Мядельское райпо, Минская область, г. Мядель, ул. 1 Мая, д. 2
Адрес предмета аукциона	Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, в районе аг. Княгинин (12,12/1,12/2,12/3,12/4,13)

Предмет аукциона (одним лотом) – здания и сооружения оптовой торговой базы в составе:

1. Ангар, инв. номер 633/С-13931, общ. пл. 348,8 кв. м.

2. Здание промышленного склада №6, инв. номер 633/С-13908, общ. пл. 348,9 кв. м.

3. Здание промышленного склада №5, инв. номер 633/С-13912, общ. пл. 483,1 кв. м.

4. Здание продовольственного склада (составные части и принадлежности: кирпичная пристройка), инв. номер 633/С-13910, общ. пл. 763,4 кв. м.

5. Здание продовольственного склада (составные части и принадлежности: дощато-шиферная пристройка), инв. номер 633/С-13907, общ. пл. 426 кв. м.

6. Здание конторы (составные части и принадлежности: две блочные пристройки), инв. номер 633/С-13909, общ. пл. 1032,7 кв. м

Сведения о земельных участках: предоставлены Продавцу по объекту №1 пл. **0,2396 га** на праве аренды (срок действия по 07.07.2116) для обслуживания здания ангара (ограничения (обременения) – охранные зоны электрич. сетей напряжением свыше 1000 В пл. 0,0021 га); по объектам №№2–6 – пл. **2,4471 га** на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений оптовой торговой базы (ограничения (обременения) – охранные зоны железных дорог пл. 2,4472 га, линий электропередачи напряжением до 1000 В пл. 0,0214 га)

Начальная цена с НДС 20% – 148 864,00 бел. руб. (снижена на 55%)

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи — **15** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

